Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І ЎПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 9 (465) | Субота, 23 сакавіка 1940 года | Цана 20 кап.

ЯШЧЭ РАЗ АБ ЛІТАРАТУРНАЙ СПАДЧЫНЕ

У нашай соцыялістычнай краіне адбываецца знамянальны працэс збірання ўсіх культурных каштоўнасцей, створаных геніем народа на працягу яго шматпакутнай і шматвяковай гісторыі. Узнятыя рукамі вялікай партыі Леніна—Сталіна да вышынь соцыялістычнай культуры вызваленыя народы СССР з любоўнай беражлівасцю, як каштоўны скарб, ахоўваюць сваю гэраічную паэзію. З велізарных, увітых золатам паэтычных тамоў устаюць грузінскія рыцары, неператожныя армянскія волаты, як сведчанне сілы і неператожнай жывучасці народа, як пацвярджэнне яго велізарнага чалавечага благародства.

Зусім не выпадкова, што на працягу невялікага, параўнальна, часу народы нашай краіны святкавалі юбілеі армянскага, грузінскага, азербайджанскага эпаса, юбілей вялікага ўкраінскага паэта Тараса Шаўчэнкі, асецінскага паэта Коста Хетагурава, геніяльнага яўрэйскага юмарыста Шолам-Алэйхема. Кожны з гэтых юбілеяў ператварыўся ў вялікае культурнае свята ўсіх народаў неабсяжнага Совецкага Саюза. Узятыя ў сваёй агульнай сукупнасці, усе гэтыя культурныя святы складаюць адну цэльную, поўную вялікага хвалюючага сэнсу карціну ўзаемнага ўзбагачэння народаў СССР сваімі культурнымі каштоўнасцямі. Наша вялікая соцыялістычная культура будуецца агульнымі намаганнямі ўсіх народаў СССР, стваараючых велічны будынак комунізма.

Беларускі народ, які толькі пасля Вялікай соцыялістычнай рэволюцыі атрымаў сваю дзяржаўнасць, стварае соцыялістычную па зместу і нацыянальную па форме культуру. Надыходзячая дэкада беларускага мастацтва ў Маскве з'явіцца бліскучай дэманстрацыяй росту нашай культуры. Выхаваныя совецкай уладай артысты, кампазітары, драматургі, мастакі пакажуць лепшыя ўзоры свайго ўзросшага майстэрства. Дэкада з'явіцца рэзультатам развіцця нашага мастацтва.

Але толькі вульгарызатары і паверхоўна мыслячыя людзі могуць адмаўляць той неабвяргальны факт, што фарміраванне і рост беларускага соцыялістычнага мастацтва абапіраецца на шматвяковы мастацкі вопыт народа, а не абмяжоўваецца двума дзесяткамі год. Наша партыя, Ленін і Сталін неаднаразова падкрэслівалі, што соцыялістычная культура не ўзнікае на голым месцы, абсолютна ачышчаным ад гістарычных традыцый, і што совецкі мастак павінен авалодаць усім багаццем мастацкіх каштоўнасцей, створаных народам. Рэалізуючы гэтыя ўказанні, наша мастацтва дасягнула значных поспехаў. Але яшчэ далёка не ўсё зроблена ў гэтым напрамку. Людзі, чыім непасрэдным абавязкам з'яўляецца работа па выданню і перавыданню лепшых літаратурных помнікаў мінулага, праяўляюць недаравальную лянoту і малую зацікаўленасць. Вось адзін невялікі, але характэрны факт. 22 сакавіка гэтага года споўнілася 100 год з дня нараджэння аднаго з лепшых беларускіх паэтаў, таленавіцейшага прадстаўніка беларускай дэмакратычнай паэзіі—Францышка Багушэвіча. Зусім ясна, што ў дні юбілея паэта, калі імя Багушэвіча ўсяляк скланяецца на старонках нашага друку, чытач перш за ўсё хоча прачытаць творы самога паэта. І тут аказваецца, што на кніжным рынку зусім адсутнічаюць вершы Багушэвіча. Чыя віна ў гэтым, чыя нядбайнасць? У першую чаргу ў гэтым вінават Інстытут літаратуры і мовы Акадэміі навук БССР, які дагэтуль не падрыхтаваў да друку навуковыя выданні твораў выдатных беларускіх паэтаў і пісьменнікаў, у тым ліку і твораў Францышкі Багушэвіча. Трэба ў самы найкарацейшы тэрмін наверстаць страчанае. Ва ўсякім выпадку, да 50-годдзя з дня смерці паэта (у сярэдзіне красавіка) трэба ў што-б гэта ні стала выдаць зборнік твораў Ф. Багушэвіча з дакладна падрыхтаванымі навуковымі каментарыямі, тэкставымі варыянтамі. Гэта што датычыць Францышка Багушэвіча. У сваёй-жа астатняй рабоце мы не павінны кіравацца чыста «юбілейнымі» меркаваннямі.

Перад намі велізарная і неадкладная задача, выкананне якой патрабуе штодзённай напружанай работы.

Узяць хоць-бы к прыкладу пытанне аб збіранні і перавыданні багацейшага беларускага фальклору. І ў гэтым напрамку трэба зрабіць вельмі многа, каб задаволіць патрабаванне нашага вырасшага чытача. У нас няма зборніка беларускай народнай творчасці, а зборнікі Шэйна, Раманава і інш. не перавыдаюцца, не перагледаюцца. Нарэшце, у нас няма кніг Дуніна-Марцінкевіча, Цёткі, Багдановіча. Аб гэтым гаварылася неаднаразова, але з усяго сказанага не было зроблена адпаведных вывадаў.

Вялікая частка віны за такое становішча ў галіне перавыдання нашай літаратурнай спадчыны падае і на крытыкаў, літаратуразнаўцаў. Яны вельмі мала і вельмі дрэнна (за рэдкім выключэннем) займаюцца пытаннямі фальклору і літаратурнай спадчыны. У нас вельмі мала артыкулаў аб выдатных беларускіх пісьменніках XIX стагоддзя і яшчэ менш работ, прысвечаных старажытнай беларускай літаратуры.

Трэба шчыльна падыйсці да пытання нашай літаратурнай спадчыны. Гэтага патрабуе совецкі чытач.

ЮБІЛЕЙ М. РЫЛЬСКАГА



Максім РЫЛЬСКІ

***

Восень. Яблык ззяе пазалотай.
Я прыехаў у нязнаны край.
— Чужаземка маладая, хто ты?
— Адгадай.

— Дай вады напіцца мне, дзяўчына!
— У вадзіцы той кахання дань.
Пачапіў я стрэльбу на галіну,
І вяду каня да бука: стань...

І гляджу я ў вочы, што напроці.
Ападае сум — як з дрэў лісты.
Шчасце ходзіць, сэрпы нам залоціць
І ў зямлю хіліць чараты.

***

Каралаў варушлівых гарады,
Марскія скалы, вадаростаў змеі,
І ўсе падманы цёмнае вады
Ён, як дзіця матулю, разумее.

Дзе залатыя скаты праплываюць,
Дзе гнёзды ўюць крыкліва бакланы,
Унукам ён пад ноч апавядае
У сівым, як ён, заліве цішыні.

Яго хаціна — з рэшты карабля,
Над ёй прыбою шум у снежных пырсках,
І ўвосень узбярэжная зямля
Яго гайдае ціха, як калыска.

Калі-ж старая прыплывае шхуна,
А ў небе ўспыхнуць зорак агенькі, —
Ахрыплы голас белага Нептуна
У яго хаціне чуюць маракі.

Пераклад Эдзі АГНЯЦВЕТ.

—о—

ПРЫВІТАННІ ЮБІЛЯРУ

ДАРАГІ МАКСІМ ТАДЭВІЧ!

Праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў Беларусі горача вітае Вас з 30-годдзем творчай дзейнасці.

Усе народы неабдымнага Совецкага Саюза добра ведаюць вашы глыбокія, полымныя творы, прысвечаныя нашай вялікай соцыялістычнай радзіме. На ўсіх шматлікіх мовах гучыць ваша выдатная песня аб Сталіне.

Мы шчыра вітаем Вас, Максім Тадэвіч, як любімага паэта. Мы вітаем вас і як чалавека, які многа аддаў сіл справе ўзаемнага азнаямлення паэтычнымі каштоўнасцямі народаў. Вашы пераклады з моваў народаў на ўкраінскую з'яўляюцца ўзорамі сапраўднага майстэрства.

Ад душы шлём Вам самыя гарачыя прывітанні і жадаем многа год здароўя і працы на карысць нашай соцыялістычнай бацькаўшчыны.

ПРАЎЛЕННЕ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ.

ДАРАГІ МАКСІМ ТАДЭВІЧ!

Шчыра вітаю са слаўным трыццацігоддзем.

Твае песні, дарагі Максім, у сэрцы ўсіх народаў нашай любімай радзімы.

Моцна абнімаю, жадаю многа год здароўя і плённай працы на карысць цвітучай Украіны.

ЯНКА КУПАЛА.

ДАРАГІ МАКСІМ ТАДЭВІЧ!

Лепшага паэта—песняра вялікага совецкага народа, выдатнейшага сына прыгожай Украіны шчыра вітаю з трыццацігоддзем паэтычнай дзейнасці.

Шмат гадоў складай песні, дарагі Максіме, і жыві шчаслівы і здаровы.

ЯКУБ КОЛАС.

ДАРАГІ МАКСІМ ТАДЭВІЧ!

Шчыра жадаю многа год жыцця, здароўя і прыгожых песень на славу радзімы.

ПЯТРУСЬ БРОЎКА.

ДАРАГІ МАКСІМ ТАДЭВІЧ!

Ад шчырага сэрца вітаю Вас з трыццацігоддзем літаратурнай дзейнасці. Шлю самыя найлепшыя пажаданні.

КУЗЬМА ЧОРНЫ.

А. ТРЫПОЛЬСКІ

СЛАЎНАЕ ТРЫЦЦАЦІГОДДЗЕ

20 сакавіка 1940 года наша грамадскасць адзначыла 30-годдзе літаратурнай дзейнасці выдатнага ўкраінскага паэта-ордэнаносца Максіма Тадэвіча Рыльскага.

Трыццаць год напружанай творчай працы прайшлі недарэмна. Імя паэта шырока вядома і любіма нашым народам. Трыццацігадовы творчы шлях упрыгожан неўміручай творчай працай на карысць свайго народа.

Пачаў свой творчы шлях Максім Рыльскі фармальна належачы да так званай «нэокласікі». І гэта дало падставу многім даследчыкам разглядаць дарэволюцыйную творчасць Рыльскага, як адыход ад жыцця, як апяванне суму і спакою.

Бяссрэчна, уплыў «нэокласікі» у дарэволюцыйнай творчасці паэта лёгка знайсці. Але гэта не галоўнае, не вядучае ў паэзіі Максіма Рыльскага. Фармальна належачы пэўны перыяд да групы «нэокласікаў», Максім Рыльскі займаў у той час зусім своеасаблівае месца. Нездзіўна, што і да гэтага часу ідуць па традыцыі за старой крытыкай творчасці Рыльскага, не заўважаючы асноўнага развіваючагася «пачатку» дарэволюцыйнай творчасці паэта.

Ужо ў першым зборніку вершаў «На белых астравах», які вышаў у 1910 годзе, можна знайсці залатое зерне, якое дало такі багаты цудоўнымі пладамі ўраджай. Тое зерне — здаровы аптымізм, бадзёрасць, нязломная вера ў сілу творчай працы, вера ў тое, што можна распаліць «багаття з іскр надії».

У наступным зборніку паэзіі «Пад асеннімі зорамі» (1918 год) ужо цалкам вызначыўся паэтычны светапогляд жыццесцвярджэння і патрабаванне занядбаць «лихе вороже слово».

Пасля Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі паэт знайшоў у рэальным быцці сонечнае жыццесцвярджэнне, якое было путяводнай зоркай яго творчасці, хоць жыло яно ва ўяўленні паэта як абстрактная мара, як паэтычная ідэя.

Адчуўшы пад нагамі цвёрды грунт росквіту шчасця чалавечага, паэт акрыліўся новымі сіламі, і яго талент расквітнеў вясновай кветкай творчай бадзёрасці. І палілася звонкая песня на славу вялікай радзімы, на славу мудрай партыі, на славу геніяльных правадыроў працоўнага чалавецтва.

Услаўляючы радзіму — квітнеючы сад, гарачы патрыёт Максім Рыльскі з глыбіні сэрца здабывае каштоўныя перлы паэзіі:

Моя батьківщина—подолана ніч.
На кремені виростий колос.
Моя батьківщина — це Леніна клич,
Це Сталіна голос.
Цвіте Казахстан, Закавказзя і Дін,
Росія цвіте і Вкраїна...
Союз непоборних радянських країв—
Моя батьківщина.

Ад берагоў Ціхага акіяна да вызваленых з панскай турмы Карпацкіх гор, ад заваяванай большэвікамі Арктыкі да сонечнай Грузіі спявае шчаслівы совецкі народ «Песню пра Сталіна», якая створана бліскучым талентам Максіма Рыльскага.

Сталін увасобіў у сабе мудрасць народа, сілу народа, праўду народа, таму ён вядзе большэвіцкую сілу, якой пакараюцца цёмныя воды і якая адпаўляе зямлю. Воля Сталіна, слова Сталіна матэрыялізуюцца ў дзеянні народных мас. Філасофска складаная думка перададзена паэтычна проста. З скарбніцы народнай творчасці чэрпае паэт фарбы, якія ніколі не завянуць. Рыльскі змог знайсці ў народнай творчасці тое, што не шмат якім паэтам удаецца выкрышталізаваць з фальклору для сваёй творчасці, каб не растварыцца, каб не страціць індывідуальнасці, творчага аблічча.

Вобразам арла, які ляціць сонечным нястрымным палётам, ламаючы ўсе перашкоды на сваім пабеданосным шляху, яскрава раскрыт вобраз мудрага правадыра, які вядзе народы шырокай дарогай да сусветна-гістарычных перамог. Вобраз легендарнага паэтычнага арла не проста параўноўваецца з чалавекам, як гэта сустракаецца ў фальклоры, а арганічна ўрастае, зліваецца з постаццю чалавека, выступаючы ў адзіным мастацкім сплаве, дапамагаючы ўсебакова, поўна ўявіць веліч і сілу рэальнага чалавека.

Больш дзесяці зборнікаў паэзіі напісаў Максім Тадэвіч: «На белых астравах», «Пад асеннімі зорамі», «Сіняя далячынь», «Скрозь буру і снег», «Трынаццатая вясна», «Дзе сыходзяцца дарогі», «Голас і адгалосак», «Знак валасоў», «Лета», «Украіна», «Кіеў» ды іншыя.

З-пад яго нястомнага паэтычнага пяра, поўнага кіпучай сілы маладосці, вышла цудоўная паэма «Марына»—першы вялікі паэтычны твор ва ўкраінскай совецкай літаратуры. Гнеўным магутным словам прыбіў паэт да ганебнага слупа польскую шляхту, разгарнуўшы велічную карціну барацьбы ўкраінскага народа з сваім адвечным ворагам. Лірычна цёплымі, сакавітымі фарбамі намаляваў паэт вобраз сялянскай дзяўчыны з свяшчэнным нажом у руках, які занесен над галовамі прыгнятальнікаў.

Колькі вогненнай паэтычнай сілы выпраменьваецца з заключных радкоў паэмы! Выбухнула паўстанне, народ расправіляецца з ворагам, агнём паўстання ахоплены сёлы:

І в заграві встае старий Наум,
Встае Марко із раною на скроні,
З ясним ножем в освяченій долоні
Кайданники тавровані встають;
І хмари сунуть, і громи гудуть,
І пісня котиться Кармалюкова,
І над усім, як зірка пурпурова,
Стоїть вона, зацінивши уста,
Струнка, вродлива, та уже не та,—
Не зляхана, заплакана дитина,—
Грімі гнів! Покара!—месниця
Марина.

Звярніце ўвагу на дынамічнасць рытму і нарастанне паэтычнай сілы ўплыву, якія захапляюць, палоняць чытача, прымушаюць яго перажываць, стаць удзельнікам падзей, якія апісвае паэт. Эмацыянальнае нарастанне ідзе з радка ў радок, зліваючыся ў заключным радку ў сілу выбуху, які падобна грому абрушваецца на галовы ворагаў.

Значнае месца ў творчасці паэта займае пейзажная лірыка. Асаблівасць гэтых вершаў у тым, што паэт з выключнай лірычнай мяккасцю ўмее спалучаць настроі, выкліканыя пейзажам, з соцыяльнымі перажываннямі людзей. Тэма пейзажа непрыкметна для чытача, без ценю нацягнутасці, перарастае ў соцыяльную тэму, карціна прыгожа намалёванага пейзажа выліваецца ў велічную, тонка нарысаваную карціну соцыяльнага жыцця. Гэта асаблівасць усёй паэзіі Максіма Рыльскага. Яскравым прыкладам можа быць верш «Мы збіралі з сынам на зямлі каштаны».

Ми збирали з сином на землі каштани,
Ми дивились довго, як хмаринка тане,
Як хмаринка тане, як співає синь,
Як колише вітер струни паутинь.

Я сказав синкові, що цвіте Вкраїна,
Бо вона — країна у Країні Рад,—
І пливла у далеч біла павутина,
І сміялось небо, як блакитний сад.
Ми збирали з сином жолуді дубові
І про слово Сталін я казав синкові,
І пливли багрові хмари в вишині,
І співала осінь весняні пісні.

Складаецца карціна гарманічнага адзінства прыроды і чалавека, упэўненасці чалавека ў заўтрашні дзень, шчасця чалавечага. Складаная філасофская думка. А як яна перададзена паэтычна, па-мастацку проста, прыгожа! А з якой паэтычнай сілай змог паэт перадаць карціну восені!

Не толькі паэзіяй высокага майстэрства ўславіўся Максім Тадэвіч Рыльскі. Яго ведае наш народ як нястомнага дзеяча шырокага фронта совецкай культуры.

Ад стварэння высокапаэтычных твораў да бліскучага перакладчыка лібрэта опер—такі дыяпазон творчасці слаўнага юбіляра. Чытач Совецкай Украіны добра ведае высокамастацкія пераклады Максіма Рыльскага на ўкраінскую мову «Еўгенія Онегіна», «Меднага конніка», «Піру ў часе чумы» і цэлага раду лірычных твораў Пушкіна; «Орлеанскай дзевы» Вальтэра, «Караля Ліра», «Дванаццатай ночы» Шэкспіра; «Кароль забаўляецца», «Эрнані» Віктара Гюго; каму не вядомы яго неперавзыйдзеныя пераклады з Міцкевіча, напрыклад, вялікі твор «Пан Тадэуш» альбо класічны пераклад «Паэтыкі» Буало. Без канца можна прадаўжаць спіс перакладаў з рускай, нямецкай, французскай, англійскай, польскай, беларускай, грузінскай, азербайджанскай, казахскай, яўрэйскай ды іншых моў, якія ўзбагачаюць украінскую культуру, служаць вялікай інтэрнацыянальнай справе і з'яўляюцца ўзорам сапраўднага майстэрства, дакладнасці і ўмення аднавіць дух найлепшых твораў мінулага і сучаснага.

Максім Рыльскі шмат перакладае сам і рэдакціруе зборнік паэзіі Лермантава. Ён можа ганарыцца цудоўнымі перакладамі лібрэта опер «Іван Сусанін», «Пікавая дама», «Мазепа», «Царская нявеста», «Травіята».

Максім Рыльскі вядзе вялікую грамадска-літаратурную работу. Ён удзельнічаў у рэдакціраванні ўкраінскага і рускага выданняў «Кабзара» Тараса Шаўчэнка. Ён рэдакціруе паэтычны аддзел журнала «Радянська література», любоўна, па-бацькоўску вырошчваючы паэтычную моладзь.

Народ, партыя, совецкая ўлада адзначылі вялікую работу аднаго з найвыдатнейшых украінскіх паэтаў, узнагародзіўшы яго вышэйшай узнагародай — ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

„НА ВЫЗВАЛЕНАЙ ЗЯМЛІ"

У Мінск вярнулася брыгада Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР у складзе П. Глебкі, В. Вольскага і А. Якімовіча, якая прымала ўдзел у перадвыбарчай кампаніі ў гор. Беластоку.

Брыгада правяла агульны сход пісьменнікаў Беластока. На гэтым сходзе П. Глебка выступіў з дакладам аб удзеле пісьменнікаў у перадвыбарчай рабоце.

10 сакавіка ў Доме партасветы адбыўся вялікі агульнагарадскі літаратурны вечар, на якім выступіў з дакладам аб беларускай совецкай літаратуры В. Вольскі. Паэты і пісьменнікі П. Глебка, А. Якімовіч, Я. Бранеўская, Е. Сельм, Рубінштэйн, Кнапгайс і інш. чыталі свае творы, прысвечаныя выбарам у Вярхоўныя Советы БССР і СССР ад заходніх абласцей.

Брыгадай падрыхтавана выданне літаратурнага зборніка «На вызваленай зямлі», прысвечанага выбарам. У зборніку змешчаны творы пісьменнікаў Беластока, напісаныя спецыяльна да выбараў.

Пераважная большасць гэтых твораў друкуецца ўпершыню. Выданне кнігі «На вызваленай зямлі» мае вялікае значэнне ў культурным і палітычным жыцці Беластока. Гэта—першая совецкая кніга, якая выдаецца ў вызваленых з-пад панскай нявολі заходніх абласцях БССР. Выданне кнігі «На вызваленай зямлі» з'яўляецца першым вопытам прыцягнення літаратурных сіл Беластока да актыўнага ўдзелу сваёй творчасцю ў грамадска-палітычным жыцці БССР. Творы, змешчаныя ў зборніку, надрукаваны на беларускай, рускай, яўрэйскай і польскай мовах.

Акрамя членаў брыгады і пісьменнікаў Беластока, у зборніку прыняў удзел масkоўскі паэт П. Герман, які знаходзіцца зараз у Беластоку.

Заўтра—выбары дэпутатаў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР ад заходніх абласцей БССР



Плакат работы мастака **Н. Гусева**, выпушчаны к выбарам у Вярхоўныя Советы СССР і БССР ад заходніх абласцей БССР.

Фота І. Каплінскага.

М. КЛІМКОВІЧ

ПАН І БАРАНАК

«Польшча — гэта баранак. Усе яе багацці па краях, на крэсах, а ў сярэдзіне пуста».

З адной прамовы Пілсудскага.

Пан, хадзіўшы за сялянкай,
Торгаў звіслы вус,
Сватаў кіем і баранкам
Нашу Беларусь.
З ім у сваты прыязджалі
Лондан і Парыж,
Распінаць нас памагалі
На ядовы крыж.

Але мы, віншць, — нявеста
Не на панскі густ:
Морду пану збілі ў цеста,
Адарвалі вус.
Білі з захаду і ўсходу,
З неба і з вады.
Пан гатоў быў скочыць ў воду,
Ды не знаў куды.
Ад штаноў згубіўшы бірку,
Пан без іх уцёк.
Ад баранка-ж толькі дзірку
Захапіў панок.

ТЭАТРЫ Ў БЕЛАСТОКУ

З пачатку лютага ў Беластоку ў памяшканні гарадскога тэатра працуе Віцебскі Дзяржаўны драматычны тэатр. За гэты час гледачу былі паказаны п'есы «Чалавек з ружжом» Н. Пагодзіна, «Мяшчане» М. Горкага, «Любоў Яравая» К. Транёва, «Пагібель воўка» Э. Самуйлёнка. Спектаклі карыстаюцца сярод гледачоў Беластока вялікім поспехам. Тэкстыльныя прадпрыемствы горада закупляюць мэтавыя спектаклі. Праводзяцца абмеркаванні пастановак. Па выхадных днях арганізуюцца ранішнікі для вучняў сярэдніх школ.

Тэатр рыхтуецца да прэм'еры п'есы П. Глебкі «Над Бярозай-ракой». У рэпертуар тэатра ўключаны п'есы «Крэмлёўскія куранты» Н. Пагодзіна, «Несцерка» В. Вольскага і «Лес» А. Астроўскага.

У памяшканні тэатра «Палас» у Беластоку працуюць Яўрэйскі драматычны тэатр і Яўрэйскі тэатр мініятур, створаныя некалькі месяцаў назад з мясцовых акцёрскіх сіл.

Яўрэйскім драматычным тэатрам кіруе рэжысёр А. Марэўскі. Рыхтуецца прэм'ера п'есы П. Маркіша «Сям'я Овадзіс». Гэта — першая совецкая п'еса, над якой працуюць яўрэйскія акцёры Беластока. Для далейшых пастановак намечаны «Бура» Шэкспіра і «Урыэль Акоста» Гуцкова.

Рэпертуар Яўрэйскага тэатра мініятур складаецца з невялікіх сцэнак, скэтчаў і вадэвіляў. Значнае месца на сцэне гэтага тэатра займаюць песні і танцы. Сярод выканаўцаў нямала бясспрэчна здольных акцёраў, але асобныя нумары рэпертуару тэатра не заўсёды ўдалыя.

У Беластоку створан таксама і Польскі тэатр мініятур, які закончыў сваю першую гастрольную паездку ў Брэст, Гродна і Ломжу.

У Беластоку-ж працуе ансамбль народнай песні і танца заходніх абласцей БССР, арганізаваны ў студзені 1940 года вядомым збіральнікам беларускіх народных песень Р. Шырмам. Ансамбль выступае ў памяшканні Дома Чырвонай Арміі.

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ АПЕРЭТА

Музычная камедыя з'яўляецца адным з папулярных відаў совецкага мастацтва, і наш глядач прад'яўляе да яе справядліва вялікія патрабаванні. Трэба шчыра сказаць, што совецкая музкамедыя ў асноўным яшчэ знаходзіцца ў перыядзе станаўлення, у перыядзе шуканняў свайго шляху і пакуль яшчэ не можа поўнасцю адказаць на патрабаванні совецкай грамадскасці. Найбольш востра адчуваецца прабел у стварэнні совецкай нацыянальнай музычнай камедыі. Прыкладам можа служыць наш Беларускі Дзяржаўны тэатр музкамедыі, які працуе ў БССР тры гады і не паставіў ні аднаго арыгінальнага беларускага спектакля. Вось чаму ўсякую спробу ў гэтай галіне трэба расцэньваць як вялікую і патрэбную справу, якая мае прынцыповае значэнне.

Цікава адзначыць, што піонерам у справе стварэння беларускай музычнай камедыі аказаўся наш старэйшы кампазітар Н. Н. Чуркін, які напісаў для самадзейнасці музкамедыю «Кок-сагыз» па лібрэта пісьменнікаў Жаўрука і Ушакова. Гэта лібрэта, пры далейшай рабоце над ім аўтараў, стане поўнацэнным творам для прафесіянальнага тэатра. За напісанне музкамедыі па гэтаму лібрэта ўзяліся кампазітары Палонскі і Іваноў.

Сюжэт музкамедыі ў агульным не складаны. У адным з калгасаў БССР разводзяць каштоўную ўсходнюю культуру кок-сагыз. Калгасная моладзь паказвае прыклад ударнай працы. У другім калгасе паспяхова ідуць справы з птушкаводствам. З-за непаразумення дырэктыва главка аб фарсіраванні работы па птушкаводству трапляе ў калгас, які разводзіць кок-сагыз. Загадчык гаспадаркі, які застаўся кіраўніком калгаса з прычыны выезду старшыні, марыць стаць «героем» і заразжа пераключае калгаснікаў на разводзенне замест кок-сагыза... курэй. Калгаснікі, ведаючы свайго непуцёвага загадчыка гаспадаркі, не пакідаюць, аднак, інтэнсіўнай работы па кок-сагызу. Непаразуменне высвятляецца, загадчык застаецца ў дурнях, а калгас едзе на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку ў Маскву.

Маладыя лібрэтысты Жаўрук і Ушакоў, для якіх «Кок-сагыз» з'яўляецца першым вялікім сцэнічным творам, паказалі сябе вельмі здольнымі і цікавымі аўтарамі. Тэкст лібрэта мастацка поўнацэнны. Добрыя вершы. Шмат задушэўнай лірыкі, дасціпных камічных становішчаў, займальных сцэн. Ярка дадзены вобразы калгаснікаў, дакладна акрэслены асноўныя лініі спектакля.

Аўтары музкамедыі кампазітары Палонскі і Іваноў намецілі зусім правільны шлях падыходу да стварэння музыкі. Шырокія, напеўныя, лёгка запамінаючыяся тэмы безумоўна знойдуць шырокі водгук у гледача, яны ў той-жа час надзвычай спрыяючыя і для выканаўцаў-вакалістаў. Тут загадзя можна прадракаць поспех. Няд рэнна задуманы і мелодычна выкананы масавыя сцэны і ансамблі, пададзеныя кампазітарамі ў народным фальклорным плане.

Тэатр музкамедыі БССР, прыступаючы да работы над першым беларускім спектаклем, павінен устанавіць творчае супрацоўніцтва з аўтарамі. Неабходна асаблівую ўвагу звярнуць на дапрацоўку фіналаў актаў, якія павінны быць больш разгорнутымі. Мае патрэбу ў перапрацоўцы і канцоўка спектакля. Кампазітарам трэба адыйсці ад вадэвільнасці асобных нумараў, знайсці для іх сувязі, падпарадкаваць іх асноўнай музычнай лініі. Важна таксама знайсці і агульны стыль музыкі. Інструментальныя нумары маюць патрэбу ў дапрацоўцы—для надання ім яркасці, больш высокай тэхнікі, выяўленчасці.

Работы, такім чынам, яшчэ шмат. Але першы этап яе ўдалы.

Удзячная задача стварэння першага совецкага беларускага спектакля музычнай камедыі—добры стымул для творчай работы аўтараў і тэатра. Няма сумнення, што грамадскасць расцэніць выкананне такой задачы як вялікую палітычную і культурную справу.

Н. ШЧЭГЛОЎ.

100-годдзе з дня нараджэння Ф. Багушэвіча

* * *

ПЕРШЫ НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПАЭТ

Ва ўмовах жудаснага палітычнага, нацыянальнага і сацыяльнага ўціску беларускі народ не мог узгадаваць сваёй нацыянальнай інтэлігенцыі. Таму дзеячамі беларускай культуры і літаратуры ў першай палове мінулага стагоддзя з'явіліся выхадцы з дробнай засцянковай шляхты. Сюды трэба аднесці Яна Баршчэўскага, Аляксандра Рыпінскага, Яна Чачота, В. Дуніна-Марцінкевіча і многіх іншых пісьменнікаў, этнографаў, археолагаў Працікнуўшыся любоўю да краю, у якім яны ўзраслі, да яго прыроды, яны кінулі першыя зерні культуры ў рольні Беларусі. Праўда, яны глядзелі на беларускі працоўны народ звысоку, нярэдка зняважліва і пагардна. Гэтыя пісьменнікі былі далёкі ад народа, які не надта прыхільна прымаў іх творы. Сярод іх, аднак, трэба выдзеліць В. Дуніна-Марцінкевіча, які пісаў толькі на беларускай мове і для беларусаў. На ім не так ярка оказалася польская тэндэнцыйнасць. Ён паклаў трывалы падмурак пад новую беларускую літаратуру, чым значна апярэдзіў сваіх сучаснікаў.

**

Пасля падаўлення паўстання 1863 года Мураўёвым-вешацелем на Беларусі настала небывалая рэакцыя. Працоўнае сялянства падвяргалася гнёту польскага панства і падвойнаму гнёту рускага самадзяржаўя. У 1865 годзе ў межах Расіі было забаронена друкаваць кнігі на беларускай мове. Беларускія кніжкі выдаваліся падпольна альбо за межамі Расіі. Пры выданні, напрыклад, «Вязанкі» Янкі Лучыны прыйшлося запэўніць цэнзара, што гэта — зборнік балгарскай паэзіі.

Але нарадзіўшыйся нацыянальны і сацыяльны рух, які выліўся ў паўстанне 1863 года, нельга было затушыць. У 80—90 г.г. узнікаюць падпольныя гурткі беларускай вучнёўскай моладзі ў гімназіях, прыходскіх школах, настаўніцкіх і духоўных семінарыях, сярод беларускіх студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў Пецярбурга, Масквы, Вільні, Варшавы, Кіева і г. д.

Усе гэтыя гурткі насілі дэмакратычны, радыкальны характар. Сваёй задачай яны ставілі барацьбу за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне беларускага народа.

Пры такіх абставінах ідэйна рос і твары Франц Казіміравіч Багушэвіч — першы нацыянальны беларускі паэт. З Пецярбургскага універсітэта ён прынёс на Беларусь ідэі рускіх рэвалюцыянераў-народнікаў.

З страсным, агністым заклікам прабудзіцца звярнуўся ён да абяздоленага беларускага селяніна. Ён заклікае яго падняць галаву, смела адстайваць свае нацыянальныя, палітычныя, сацыяльныя і чалавечыя правы. Вось што піша ён у «Прадмове» да «Дудкі беларускай», якая ўбачыла свет у 1891 годзе пад псеўданімам Мацея Бурачка: «Наша мова для нас святая... І гаворым мы ёй шмат добра, але так ужо мы самі пусцілі яе на здзек, не раўнуючы, як і паны вялікія ахватней гавораць па-французску, як па-свойму». І вось як паэт адзываецца аб сваіх папярэдніках у «Прадмове» да зборніка «Смык беларускі», першае выданне якога з'явілася ў 1894 годзе пад псеўданімам Сымона Рэўкі з-пад Барысава: «Здаралася і мне чытаць і ксёнжачкі, хоць не надта старыя, друкаваныя, нават якогась пана Марцінкевіча, але ўсе як-бы смяючыся з нашага брата пісаны...»

Як бачым, больш за ўсё ўвагі паэт звяртае на духоўную культуру, на мову, якую народ павінен берагчы, як багацейшы скарб свой.

Тут мы лічым патрэбным спыніцца крыху на «нацыяналізме» Ф. Багушэвіча. Многія нашы літаратары не зразумелі асаблівасцей яго і гэта паслужыла ім прычынай прынізіць гісторыка-літаратурную вартасць паэта. Чаму так адбылося? Справа ў тым, што гэтыя літаратары не дыялектычна падышлі да разумення праблемы нацыяналізма, а з вульгарна-сацыялагічнага пункту погляду. Яны не зразумелі альбо не хацелі адрозніць дарэвалюцыйны беларускі нацыянальны рух, які быў вялікай, магутнай прагрэсіўнай з'явай, які ніяк не мог існаваць у адрыве ад праблемы сацыяльнай, а толькі ў канкрэтнай сувязі з ёю, ад паслярэвалюцыйных беларускіх нацдэмаў, гэтых заклятых ворагаў, якія імкнуліся адарваць беларускі народ ад вялікай сацыялістычнай дзяржавы і перадаць яго зноў у лапы капіталізма. «Для ўкраінцаў і беларусаў, напр., толькі чалавек, які жыве на Марсе, змог-бы адмаўляць, што тут няма яшчэ завяршэння нацыянальнага руху, што абуджэнне мас да валодания роднай мовай і яе літаратурай (а гэта неабходная ўмова і спадарожнік поўнага развіцця капіталізма, поўнага пранікнення абмену да апошняй сялянскай сям'і)—тут яшчэ адбываецца. «Айчызна» тут яшчэ не спела ўсёй сваёй гістарычнай песні». (Ленін, т. XIX, стар. 204—205).

Францышак Багушэвіч глядзеў на жыццё вачыма закутага, эксплаатыруемага, ашукваемага беларускага працоўнага сялянства. Горам яго асабістым было гора змучанага цёмнага люду.

Плач, як мае вочы,
Над народу доляй...
Іграй слёзным тонам
Над народу скснам!...—

так звяртаецца ён да сваёй дудкі. Такую задачу ён ставіць перад сабой, лічыць гэта святым абавязкам, аддае гэтаму горкаму плачу ўсё сваё жыццё.

Як крыві не стане,
Тагды скончу граннe!—

самаадпана заяўляе пясняр.

Гэтыя песімізм, рослы не былі асабістым пачуццём паэта. Ф. Багушэвіч стаў выразіцелем пачуццяў народных. Вось такое ўтаймоўцтва якраз не гучала безнадзейнасцю і бязвер'ем, а грымела грознай перасцярогай да ўсіх віноўнікаў пакут спрадвечнага народа.

Ф. Багушэвіч паказаў сацыяльны антаганізм між панствам, буржуазіяй і працоўным сялянствам. У вершы «Дурны мужык, як варона» паэт гаворыць аб тым, што мужык «арэ, сее ўсё лета», касцёлы будуе, раскошныя палацы,—

А сам жыве ў мокрай яме,
Дзверы заткнуў анучамі.

Мужык гэты ўладае тытанічнай сілай і вынослівасцю, працуе да знямогі, а жыве ў галадзе і холадзе.

З камаровы нос сякерку
Спісне, крэкне, замахае,—
Зрубе пушчу, як талерку,
Свет дрывамі закідае.
А у хаце — зварыць страву
Пашчапае старую лаву!

А яшчэ яскравей раскрываецца гэта сацыяльная безадань у вершы «Бог не роўна дзеліць». Тут паэт увасабляе ў двух чалавеках багацце і ўбоства. Адзін ходзіць «у золаце з плеч да ног», а другі «ўвесь як рэшата свіціцца»; «адзін мае хатаў многа», а другі жыве з каровамі, свіннямі, курамі. Адзін есць «толькі мяса ды пірог», а другі «хлеб жуе з мякінай, хлебча квас ды лебяду».

А чаму-ж гэта так? Чаму такая крыўдная несправядлівасць? Дзе выйсце?

Вось гэтага якраз Ф. Багушэвіч не паказаў. Ён нават спадзяецца на пана, пытаецца ў яго аб мужычай «ксёнжцы», заклікае працаваць і шанаваць мужычы мазоль, падаць руку сляпому, вывесці яго на сапраўдную дарогу. «Не роўна дзеліць бог»,—гаворыць паэт. Ён шукае праўду, не можа знайсці яе і звяртаецца зноў да бога:

Да пашлі-ж ты, божа, праўду
свою тую
З неба на зямельку, слязьмі
залітую!

Часта ён бачыць прычыну ўсіх няшчасцяў у бескультур'і беларуса, у яго невуцтве («Дурны мужык, як варона»). У вершы «У астрозе» гаворыцца аб нянавісці да царскіх чыноўнікаў. Паэт запэўнівае, што «у законе ўсе роўны—і пан, і мужык», што чын і мундзір не гавораць аб якасцях чалавека:

Мундзір хоць надзень, жупан
хоць ці новы,
А дурнем-жа будзе дурны, безгаловы.

Гора недаступна ідзе за няшчасным селянінам. А збаўленне—вось у чым:

Мусіць бог яго (гора—**І. Л.**) з душою
Разам возьме, разам даў.

Але трэба адзначыць, што вершы Францыска Багушэвіча ведалі напамяць і прапагандыравалі ў народзе ўдзельнікі рэвалюцыйна-дэмакратычных гурткоў. Напомнім, што 8 яго вершаў увайшлі ў падпольна выданы ў 1904 годзе зборнік «Песні». На творчасці Ф. Багушэвіча выраслі і волаты беларускай паэзіі Янка Купала і Якуб Колас, якія ў 1905 годзе кінулі ў сялянскія масы Беларусі агністыя заклікі да паўстання. Вывад з вершаў Ф. Багушэвіча зрабіла працоўнае сялянства, якое ў 1905 годзе знайшло выйсце з становішча, праўдзіва намалёванага паэтам, ва ўзброеным паўстанні.

Шуканне праўды і правасуддзя—гэтая тэма чырвонай ніццю праходзіць праз усю паэзію Ф. Багушэвіча. Эксплаатыруемае, прыгнечанае сялянства пазбаўлена праўды. Яно разумее, што гэту праўду прысвоілі сабе прыгнятальнікі. Сюды адносяцца вершы «Праўда», «У астрозе», «Як праўду шукаюць», «У судзе» і «Кепска будзе».

З найвялікшай шчырасцю і прастатой гаворыць паэт аб згубленай праўдзе, у якую верыць народ:

Даўней, кажуць, праўда па свеце
хадзіла,
Жабруючы-ж змерла, а людцы
схавалі...

Ф. Багушэвіч усе намаганні свае аддаваў справе ўздыму нацыянальнай культуры. Служэнне народу—вось яго святая місія. Яму даражэй за ўсё яго бедны, занядбаны, невясёлы і непрыглядны край, ён не прамяняе яго ні на якія багацці і раскошы:

Ды мне даражэйшы угол гэты
гнілы,
Камень пры дарозе, пясок ля
магілы,
Як чужое поле, як дом мураваны!
Не аддам за сурдут каптан свой
падраны.

Гэтая-ж думка ляжыць у аснове «Калыханкі» і «Афяры» з цыкла «Песні». З вершамі, поўнымі злосці і абурэння, звяртаецца ён да рэнегатаў, адступнікаў ад свайго народа.

Вялікую ўвагу паэт аддаваў апрацоўцы фальклорных матываў, народных павер'яў. Вынікам гэтага з'явіліся вершы «Хцівец і скарб святога Яна», «Балада», дзе скарыстаны фальклорны і літаратурны сюжэт аб прадажы душы чорту, «Здарэнне», «Быў у чыстцы», «Дзе чорт не можа, там бабу пашле». У гэтыя фальклорныя матывы, часам рэлігійныя, паэт уклаў вялікі сацыяльны змест.

У заключэнне адзначым тое, што Францышак Багушэвіч тварыў пад непасрэдным уплывам рускай і украінскай літаратуры. Дастаткова прачытаць верш Ф. Багушэвіча «Думка», каб адчуць тут уплыў верша Т. Г. Шаўчэнка «Чого мені тяжко, чого мені нудно».


Аб уплыве «Тучек» М. Ю. Лермантава на «Хмаркі» Багушэвіча гаварылі ўжо шмат разоў.

Вобразы з «Балады» і верша «Хцівец і скарб святога Яна» узнікалі не без актыўнага ўспрыняцця паэтам вобразаў з «Заколдованного места» і «Вечера накануне Ивана Купалы» ў «Вечерах на хуторе близ Диканьки» Н. В. Гогаля.

Усю сваю сілу, усё жыццё свае, усю моц і веліч свайго талента аддаў Франц Казіміравіч Багушэвіч беларускаму народу. Горкае, беспрасветнае жыццё, вялікая вера ў творчыя магчымасці беларускага народа і ў яго вялікую будучыню адбіліся, як у люстры, у паэзіі нашага незабыўнага песняра.

Народ наш, вызвалены і з'яднаны ў адну магутную сям'ю, знайшоўшы тую вялікую праўду, якую так прагна шукаў Ф. Багушэвіч, доўга яшчэ будзе насіць у сабе і шанаваць памяць яго, першага свайго нацыянальнага паэта.

І. ЛЯНДРЭС.



Франц Казіміравіч Багушэвіч.

(Фота інстытута літаратуры і мовы АН БССР).

САТЫРА І ЮМАР Ф. БАГУШЭВІЧА

Смех можа быць вялікім сродкам мастацкага ўздзеяння. Смеху баіцца нават той, хто ўжо нічога не баіцца,—гаварыў вялікі рускі сатырык Н. В. Гоголь. Юмар і сатыра—віды смешнага, пры дапамозе якіх пісьменнік можа дасягаць і дасягае належнага паэтычнага эфекта пры паказе тых альбо іншых адмоўных з'яў рэчаіснасці.

Ф. Багушэвіч быў сялянскім дэмакратам. Ён спачуваў працоўнаму сялянству, любіў сваю краіну і народ і ў сваёй творчасці сатырычна высмейваў усіх, хто здзекваўся з працоўнага селяніна. Сатыра і юмар Ф. Багушэвіча ў абрысоўцы памешчыкаў і царскіх чыноўнікаў больш завостраны і сацыяльна акрэслены, чым, напрыклад, у Дуніна-Марцінкевіча, Янкі Лучыны і Каганца. Шарж і гратэск, як асноўныя прыёмы Багушэвічавай сатыры, будуюцца на аснове смелых і дасціпных параўнанняў альбо камічных сітуацый. Так, у творы «Быў у чыстцы» для сатырычнага высмейвання паноў Ф. Багушэвіч ставіць іх і наогул эксплаататараў у надзвычай безвыхаднае і камічнае становішча. Вуснамі селяніна Мацея, убачыўшага ў сне, што ён трапіў у пекла, паэт апавядае аб «чыстцы», дзе «чэрці кормяць смалой і цягаюць, і рвуць, запрагаюць у воз, кручком цягнуць кішкі і зубамі за нос, вочы колюць ражном, пузырамі рвуць твар, скрабуць скуру нажом, як на боты тавар». У такую абстаноўку трапляюць паны пасля смерці і адбываюць кару за здзекі з працоўных:

З мужыкоў тут не надта каб шмат,
А ўсё больш дык багатых паноў,
На зямлі адцярпеўшы наш брат
На той свет, як па масле, плыве.
А панам дык і трудна цярпець,
Без прывычкі дык стогнуць, аж
страх!
Глянеш—пан, як здаецца, мядзведзь,
А чорт дышлам запрог, і трах-тарарах...

Тут-жа разам з панамі сядзіць і ксёндз, якога «чорт аблажыў грашыма, запаліў у грашох тых і ксёндз так гарыць». А другі ксёндз «дык вісіць, але як?—Дык і стыдна мне вам гаварыць, а са стыду чырвоны, як рак, вочы жмура, як кот, і гарыць...»

Вось такім парадкам, ставячы крыўдзіцеляў народа ў надзвычай камічныя палажэнні і карыстаючыся пры гэтым рэзка-саркастычнымі лексічнымі выразамі, накіраванымі супроць прыгнятальнікаў, Ф. Багушэвіч у сваёй сатыры дасягае вялікага сацыяльна-палітычнага эфекта.

Выкрывальна-рэзкай сатырай гучаць творы Ф. Багушэвіча «Як праўду шукаюць», «У астрозе», «У судзе», «Хрэсьбіны Мацюка», дзе высмейваюцца ўраднікі, царскае «начальства законнай уласці», бюракратычны суд самадзяржаўя і дзікі царскі русіфікатар князь Хаванскі. Пры сатырычным выкрыцці нягоднасці царскага начальства і суда Ф. Багушэвіч карыстаецца прыёмамі сказа, г. зн. апавядае аб здарэннях і фактах вуснамі селяніна. Селянін расказвае (верш «У астрозе») пра ўрадніка, які складаў пратакол на селяніна за тое, што той спаліў гнілы калок, які тырчаў на яго палосцы. У словах селяніна выражана вялікая сіла народнага абурэння супроць ураўніка.

Ф. Багушэвіч быў не задаволен рэформай 1861 года, якая не раскрыпасціла, а яшчэ больш закабаліла працоўных. Вуснамі селяніна Мацея (твор «Быў у чыстцы») Ф. Багушэвіч выкрывае драпежніцкі характар рэформы, пасля якой стала «не надта свабодна ў гэтай свабодзе», таму што «болей настала паноў». У падлічваючага на пальцах новых паноў селяніна Мацея «падымалася ад страху чупрына», бо «пальцаў не стала на ўвесь гэты шчот, а пальцамі-ж трэба кармiць» гэтых паноў-прыгнятальнікаў.

Рэзка бічуе Ф. Багушэвіч усю сістэму царскага суда і судовае бюракратычнае начальства:

Судоў нарабілі, начальстваў ці мала:
Пасрэднік і валасць, сінод і сенаты,
Прысутствы і вокруг, управы, палаты;
Найбольш міравых, участковых і з'ездаў.
Што ў полі каменняў, што гвездаў!
Затое-ж жыццё цяпер труднае стала.

І Ф. Багушэвіч далей канкрэтна паказвае ў творы «Як праўду шукаюць», да чаго бюракратызм і нястрымнае хабарніцтва царскага суда даводзяць ні ў чым невінаватага селяніна, які ўсяго-на-ўсяго ехаў «у Вільню адведаць сынка». Спачатку ўраднік пытаецца ў селяніна, ці бачыў ён, «як мельнік смяяўся, як пан з фурманом у карэце купаўся, як злодзей з-пад млыну цікавіўся з коні», і ці ведае ён, «хто-то забіты валяўся і кім забіты»? Затым ураднік абвінавачвае селяніна за тое, што апошні не хацеў ратаваць фурмана, што ён (селянін) «майстра таго не даві ў для млына», што «сукні ад бабы кусліваі не гнаў» і г. д. Сваім бязглуздым допытам ураднік мучыў селяніна да таго часу, пакуль селянін не даў яму рубель хабару. Справа на гэтым не скончылася. Праз восем тыдняў соцкі прынёс селяніну павесткі, на якіх яму патрэбна было з'явіцца на суд: «у першай—сведкай, як мельнік цікаваў; у другой—сведкай, што мост без прыгляд; у трэцяй—сведкай, як коні хтосьці краў; у чацвёртай—сведкай, што труп пры дарозе быў убіты, а двое людзей уцякалі; аж на шостай ужо дык я стаў вінават, што ратунку не даў, як карэта плыла».

Рэзка высмеяны камедыя царскага суда і бюракратычныя камедыянты-чыноўнікі ў творах Ф. Багушэвіча «У судзе» і «Кепска будзе». Ф. Багушэвіч удала выкарыстоўвае дэталь пры сатырычнай зарысоўцы чыноўніка-бюракрата з царскага суда:

Той судзебнік маладзенькі,
Такі быстры, хоць маленькі,
Усё пытаецца ды піша
І нагою ўсё калыша.
. . . .
Пісаў, пісаў, даў другому
І сам пашоў кудысь з дому.

Юмар Ф. Багушэвіча таксама носіць своеасаблівы характар. Гэта—смех прастадушны, адкрыты і рэзкі, які не саромінца асобных «пікантных» слоўцаў. Змест юмарыстычных вершаў Ф. Багушэвіча складаюць сацыяльна-бытавыя пытанні, а яго асноўным мастацкім сродкам з'яўляецца дасціпная народная іронія.

Юмарыстычная песня Ф. Багушэвіча «Чаго бяжыш, мужычок?», пабудаваная ў дыялагічнай фальклорнай форме пытанняў і адказаў на іх селяніна, з'яўляецца, па сутнасці, сатырычным памфлетам на царска-памешчыцкі лад:

Чаго бяжыш, мужычок?
—Паганяе мароз.
Чаго ляжыш, мужычок?
—Бо ўрадніка вёз.
Чаго ты п'еш, мужычок?
—Бо і хлеба не еў.
За што ты б'еш, мужычок?
—Бо і сам тое меў.
Нашто ты краў, мужычок?
—Бо свайго не знаў.
Чаму ты лгаў, мужычок?
—Бо хтось праўду ўкраў.

І на пытанне «чаго умёр, мужычок?» селянін адказвае: —Уцякаў ад «закона», г. зн. усё сваё жыццё селянін быў бясправным, з яго здзекваліся, як хацелі, пануючыя класы, і толькі смерць для мужыка з'явілася збаўленнем ад царскіх «законаў».

Цудоўны верш Ф. Багушэвіча «Калыханка», на якім адчуваецца ўплыў народнай песні Н. Някрасава, праскнут глыбокай сацыяльнай іроніяй і юмарам, выражаючым нянавісць народа да паноў. Значнае месца ў паэзіі Ф. Багушэвіча займае бытавы юмар, пры дапамозе якога ў творах «Хцівец і скарб святога Яна», «Сватаны», «Сватанне» і інш., пабудаваных на камічных народных сюжэтах, рэзка высмеяны такія бытавыя з'явы, як хцівасць і прагнасць на грошы, жаданне без працы зрабіцца шчаслівым, гультайства і абібоцтва сярод некаторых людзей і інш.

Такім чынам, сатыра і юмар Ф. Багушэвіча з'яўляліся магутным мастацкім сродкам пры рэалістычным паказе істотных бакоў тагочаснай рэчаіснасці.

М. ЛАРЧАНКА.

* * *

У ПЕЦЕРБУРГСКІМ УНІВЕРСІТЭЦЕ

НОВЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ БІЯГРАФІІ БАГУШЭВІЧА

Біяграфічныя весткі аб Ф. К. Багушэвічу скудныя. Яны абмяжоўваюцца нешматлікімі фактамі з яго жыцця, пададзенымі без усякіх падрабязнасцей, нават без дакладных храналагічных указанняў.

Аб прабыванні Ф. Багушэвіча ў Пецербургскім універсітэце да апошняга часу было вядома толькі тое, што ён быў студэнтам гэтага універсітэта па фізіка-матэматычнаму факультэту і перад паўстаннем 1863 года паехаў на радзіму.

Мы маем магчымасць паведаміць дакладна аб прабыванні Багушэвіча ў Пецербургскім універсітэце.

У Ленінградскім абласным гістарычным архіве, сярод спраў Пецербургскага універсітэта, захоўваюцца матэрыялы аб Ф. Багушэвічу. Матэрыялы гэтыя знаходзяцца ў справе праўлення універсітэта аб прыняцці ў лік студэнтаў Франца Багушэвіча («Справа 1861 года. Пачата 15 верасня 1861 года. Скончана 16 лістапада 1861 года № 95»).

Вось што даюць матэрыялы гэтай «Справы».

26 ліпеня 1861 года з Вільні Багушэвіч падаў рэктару універсітэта заяву наступнага зместу:*)

«Пабуджаемы гарачым жаданнем прадаўжаць адукацыю ў вышэйшай навучальнай установе, маю гонар пакорліва прасіць Ваша Правасхадзіцельства прыняць мяне ў лік студэнтаў С-Пецербургскага універсітэта па матэматычнаму факультэту. Пры гэтым маю гонар прадставіць наступныя дакументы: а) атэстат аб скончанні курса навук у Віленскай губернскай гімназіі за № 1097, б) пасведчанне аб паходжанні ад Віленскага дэпутацкага сходу за № 362 і в) метрычнае пасведчанне аб нараджэнні за № 43 («Справа», л. 2).

У той-жа дзень рэктару універсітэта была пададзена другая заява — аб вызваленні Багушэвіча ад платы (50 рублёў) за права навучання. (Л. 3).

4 жніўня канцылярыя універсітэта прасіла віленскага паліцмейстара абвясціць Багушэвічу, каб ён з'явіўся ў універсітэт для здачы экзамена. (Л. 5).

23 жніўня віленскі паліцмейстар паведаміў канцылярыю універсітэта, што Ф. Багушэвіч «па зробленаму розыску ў гор. Вільні не адшукан». (Л. 6).

У «Справе» захавалася загатоўленая для Багушэвіча, як студэнта, матрыкула. Гэта невялікая кніжачка ў 64 старонкі. На стар. 13 матрыкулы значыцца наступнае:

«Франц Багушэвіч з дваран Віленскай губерні атрымаў першапачатковую адукацыю ў Віленскай губернскай гімназіі, ад якой мае атэстат, выдадзены яму 27 чэрвеня 1861 года за № 1097, з засведчаннем аб здольнасці да паступлення ў універсітэт і з правам на чын XIV класа пры ўступленні ў грамадзянскую службу».

На стар. 14 напісана: «Фр. Багушэвіч прыняты ў 1861 г. 15 верасня без экзамена ў лік студэнтаў Імп. Пецербургскага універсітэта па фізіка-матэматычнаму факультэту, разр. матэматычных навук у 1 курс».

На стар. 15 запісана, відавочна, па метрычнаму пасведчанню: «Франц Багушэвіч веравызнання рымска-каталіцкага, нарадзіўся 9 сакавіка 1840 года».

13 лістапада Багушэвіч падаў рэктару універсітэта наступную заяву:

«Будучы цяжка хворым з 20 верасня па цяперашні час, я не мог атрымаць матрыкулу ў сучасны момант з прычыны неспрыяючага маёй хваробе клімату, па парадзе лячыўшага мяне доктара, я павінен накіравацца на месца маёй радзімы, а таму пакорліва прашу Ваша Правасхадзіцельства зрабіць распараджэнне аб выдачы мне дакументаў, а таксама і пасведчання з універсітэцкага ведамства. Пры гэтым маю гонар прадставіць пасведчанне ад лячыўшага мяне доктара». (Л. 9).

16 лістапада праўленне універсітэта пастанавіла: «Лічыць Багушэвіча звольненым з універсітэта па заяве, у знак чаго і выдаць яму належнае пасведчанне аб звальненні». (Аб. л.9).

У той-жа дзень было загатоўлена пасведчанне аб звальненні, а 17 лістапада на чарнавіку гэтага дакумента Багушэвіч распісаўся ў атрыманні пасведчанняў аб незаможнасці, доктарскага і звальніцельнага.

На гэтым «Справа» канчаецца. Іншых спраў, якія маюць якое-небудзь дачыненне да Багушэвіча, у архіве не адшукана.

Для біяграфіі пісьменніка асаблівую цікавасць прадстаўляе пасведчанне аб яго паходжанні і метрычнае пасведчанне. Нажаль, дакументы гэтыя ў «Справе» не захаваліся. На стар. 9, пад прыведзенай вышэй заявай Багушэвіча аб выдачы яму дакументаў, ёсць прыпіска алоўкам, якая напісана рукой якогасьці з канцылярскіх служачых: «Дакументы адасланы да Обер-паліцэймейстара, № 2479». Відавочна, у гэтай прыпісцы гутарка ідзе іменна аб тых дакументах, якія прадстаўляюць для нас найбольшую цікавасць. З прыпіскі не відаць, якому обер-паліцмейстару і для чаго накіраваны дакументы Багушэвіча. З віленскай паліцыйнай канцылярыя універсітэта зносілася праз віленскага паліцмейстара (гл. «Справу», стар. 5—6). Значыць, у прыпісцы маецца на ўвазе пецербургскі обер-паліцмейстар. Але калі і для чаго былі накіраваны да яго дакументы Багушэвіча?

Для адказу на першае пытанне трэба супаставіць наступны факт: звальніцельнае пасведчанне Багушэвіча, атрыманае ім 17 лістапада, запісана ў адсыльны журнал пад № 2865, а дакументы обер-паліцмейстару накіраваны пры адсыльным № 2479. Значыць, пам'ж днём накіравання дакументаў у паліцыю і днём выдачы звальніцельнага пасведчання мінула 386 адсыльных нумароў. Лічачы, што канцылярыя універсітэта рэгістрыравала ў сярэднім штодзённа 10—12 адсыльных папер, мы атрымаем, што паміж гэтымі датамі мінула 30—35 рабочых дзён, г. зн. дакументы былі накіраваны обер-паліцмейстару ў сярэдзіне кастрычніка.

Каб адказаць на пытанне: навошта спатрэбіліся пецербургскаму обер-паліцмейстару дакументы Багушэвіча, трэба ўспомніць, што адбывалася ў універсітэце восенню 1861 года.

Паступленне Багушэвіча ў Пецербургскі універсітэт супала з пачаткам студэнцкіх хваляванняў 1861 года. Успомнім галоўнейшыя факты тагочасных падзей.

Прычынай да студэнцкіх «беспарадкаў» паслужыла ўвядзенне новых правілаў аб наведванні лекцый. Згодна царскага павялення ад 31 мая 1861 года, правілы гэтыя былі выпрацаваны асобай камісіяй з прафесараў універсітэта пад старшынствам праф. П. Л. Чэбышова. У верасні правілы ўступілі ў дзеянне. Яны былі надрукаваны і прызначаліся для раздачы студэнтам у выглядзе «матрыкул». Студэнты адмаўляліся атрымліваць гэтыя матрыкулы. Нармальная плынь акадэмічнага жыцця была парушана. Пачаўшыяся 18 верасня лекцыі хутка былі спынены да 11 кастрычніка. З гэтага дня выкладанне аднавілася і прадаўжалася да 19 снежня. Але з прычыны таго, што нармальнае навучальнае жыццё не магло наладзіцца, дык 20 снежня універсітэт быў зачынен да перагляду універсітэцкага статута 1835 года. Для даследвання «беспарадкаў» урадам былі прызначаны асобыя камісіі. Па дакладах гэтых камісій 4 снежня 1861 года паследвала царскае павяленне аб пакаранні найбольш вінаватых у «беспарадках» студэнтаў. 5 студэнтаў было выключана з універсітэта з высылкай іх у паветовыя гарады аддаленых губерній пад нагляд паліцыі. 32 студэнты выключаны з універсітэта з аддачай іх на парукі сваякам і 192 студэнты атрымалі строгае ўпіачуванне.

Ці прымаў які-небудзь удзел у універсітэцкіх падзеях Ф. Багушэвіч? Для прамога адказу на гэта пытанне няма ніякіх матэрыялаў. У спісах пацярпеўшых за «беспарадкі» студэнтаў прозвішча Багушэвіча не значыцца, хоць сярод 224 пацярпеўшых ёсць і 53 студэнты першага курса. Але гэта не азначае, вядома, што і ў сапраўднасці Багушэвіч не меў ніякіх адносін да «беспарадкаў». З «справы» № 35 відаць, што матрыкулы Багушэвіч не атрымаў. У сваёй заяве аб выдачы яму звальніцельнага пасведчання ён растлумачыў гэта хваробай. Між тым самы факт звальнення з універсітэта праз два месяцы пасля паступлення і асабліва паспешлівасць у атрыманні звальніцельнага пасведчання гавораць аб тым, што звальненне Багушэвіча з універсітэта было прымусовым і дыктавалася меркаваннямі палітычнага характару. У сувязі з гэтым робіцца зразумелай і прыведзеная вышэй прыпіска канцылярыі універсітэта аб высылцы дакументаў обер-паліцмейстару. Відаць, асабістыя дакументы Багушэвіча за месяц, прыкладна, да яго звальнення былі затрабаваны пецербургскай паліцыяй. Супастаўленне гэтых урывачных даных дазваляе зрабіць заключэнне аб тым, што Ф. Багушэвіч у нейкай форме меў дачыненне да справы студэнцкіх «беспарадкаў» 1861 года. Каб пазбегнуць расправы адміністрацыйных улад, ён паспешліва паехаў з Пецербурга, атрымаўшы з канцылярыі універсітэта толькі частку дакументаў і не атрымаўшы астатніх таму, што яны былі ўжо ў руках паліцыі.

Такім чынам устанаўліваецца, што прабыванне Багушэвіча ў Пецербургскім універсітэце было непрацяглым: 15 верасня 1861 года ён быў залічан у універсітэт, а 17 лістапада таго-ж года ён атрымаў звальніцельнае пасведчанне і паехаў на радзіму. На працягу двухмесячнага прабывання ў Пецербургу лекцый Багушэвіч не слухаў (матрыкула засталася не атрыманай), ды і чыталіся гэтыя лекцыі нерэгулярна.

Цяпер, калі ўстаноўлена кароткачасовасць прабывання Багушэвіча ў Пецербургу, не прадстаўляецца магчымым гаварыць аб тым, што прабыванне ў універсітэце адыграла буйную ролю ў фарміраванні светапогляду будучага паэта.

І. КУЗЬМІН.

*) Дакументы цытуюцца ў перакладзе. —Рэд.

ЮБІЛЕЙНЫЯ ВЕЧАРЫ

У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння Францышка Багушэвіча Саюз савецкіх пісьменнікаў БССР ажыццяўляе рад мерапрыемстваў.

29 сакавіка адбудзецца агульнагарадскі вечар, прысвечаны жыццю і творчасці паэта. З дакладам выступіць тав. Ларчанка. У вечары прымуць удзел беларускія пісьменнікі-ордэнаносцы Янка Купала, Якуб Колас, Змітрок Бядуля, Пятро Глебка і інш.

Вечар, прысвечаны Ф. Багушэвічу, адбудзецца і на радзіме паэта—у Ашмянскім раёне. Для ўдзелу ў вечары ў Ашмяны выязджае брыгада пісьменнікаў у складзе Зм. Бядулі, М. Танка, Э. Агняцвет, Я. Шарахоўскага.

На буйнейшых прадпрыемствах гор. Мінска адбудуцца гутаркі аб Ф. Багушэвічу. У якасці дакладчыкаў праўленне Саюза пісьменнікаў вылучыла т. т. Барысёнка, Ларчанку, Кучара, Шарахоўскага, Фігілоўскую і інш.

У дні юбілея Саюз пісьменнікаў арганізуе радыёперадачу, прысвечаную Ф. Багушэвічу. З дакладам аб творчасці паэта перад мікрафонам выступіць тав. Барысёнак.

АБМЕРКАВАННЕ ЗАДАЧ РАБОТНІКАЎ МАСТАЦТВАЎ НА 1940 ГОД

ТВОРЧЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

****

А. Б. АЗІРСКІ
Начальнік Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР.

Вызначаючы задачы работнікаў мастацтваў у 1940 годзе, неабходна коротка падагуліць работу мінулага года, каб на гэтым абагульненні вопыту правільна вызначыць перспектыву далейшага развіцця мастацтваў БССР.

Не будзе пераўвелічэннем адзначыць, што 1939 год быў годам сур'ёзнага ўздыму мастацтваў нашай рэспублікі. Аб гэтым сведчыць стварэнне беларускіх опер і балета, пастаноўка на сцэне Беларускага Драмтэатра новых п'ес беларускіх драматургаў, умацаванне раду тэатральных калектываў: Магілеўскага Дзяржаўнага рускага тэатра, тэатра музыкальнай камедыі, стварэнне новых тэатраў: у Гомелі — абласнога, у Рэчыцы — калгасна-саўгаснага.

Вялікія поспехі мы маем у галіне музыкі. Пасля стварэння першых беларускіх опер і балета, далейшы рост музычна-опернай творчасці вызначаецца такімі творамі, як опера «Кацярына» Шчэглова, балет «Бывайце здаровы» Кабалеўскага. Паспяхова працуюць у гэтым напрамку кампазітары: Аладаў — над балетам, Залатароў — над операй «Над ракою Бярозай», Падкавыраў — операй «Як гартавалася сталь». Створаны новыя сімфанічныя творы: танец-сюіта і фантазія на беларускія тэмы Залатарова, сімфанічная паэма «Дума пра Лагоду» Аладава, сімфанічная паэма Столава на тэму вызвалення Заходняй Беларусі.

Творы кампазітараў Цікоцкага, Крошнера, Багатырова, Туранкова, Шчэглова і іншых заслужылі шырокае прызнанне.

Большай увагі патрабуе стварэнне песень, совецкага раманса, совецкага лірычнага музыкальнага твора для камернага выканання. У гэтым напрамку павінны працаваць і нашы паэты.

Значны поспехі і ў развіцці выяўленчых мастацтваў. У 1939 годзе адкрыты музей Пэна ў Віцебску і рэспубліканская Карцінная галерэя. Мастакі БССР творча аб'яднаны работай для выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці».

Усе гэтыя поспехі з'яўляюцца рэзультатам нястомных клопатаў партыі і ўрада аб мастацтве.

Сур'ёзнай умовай для ўздыму мастацтваў з'явілася рашэнне СНК СССР аб правядзенні дэкады беларускага мастацтва ў гор. Маскве.

Да дэкады застаўся адзін месяц. За гэты адрэзак часу Опернаму тэатру трэба закончыць работу над операй «Кветка шчасця», дапрацаваць балет «Салавей». Філармоніі неабходна паскорыць закончэнне афарміцельных работ. Перад Драматычным тэатрам стаіць задача дапрацаваць спектаклі «Партызаны» і «Пагібель воўка».

Асноўнай задачай работнікаў мастацтваў БССР, як і мастацтваў усяго Совецкага Саюза, з'яўляецца стварэнне совецкіх класічных твораў.

Кадры нашага мастацтва творча сспелыя для таго, каб паспяхова вырашаць задачы стварэння класічнай совецкай п'есы, музычнага твора, твораў выяўленчага мастацтва.

У сувязі з гэтым неабходна ўзняць пасобныя пытанні, звязаныя з далейшым развіццём драматургіі.

У беларускай літаратуры, у прыватнасці ў драматургіі мінулага, народ і яго прадстаўнікі паказваліся, як пакутуючыя людзі, асуджаныя на адсталасць, падкрэсліваліся настроі безвыходнага гора і пакорнасці лёсу. Гэта сказалася і на стылі выяўленчых прыёмаў. Натуралістычны паказ самых змрочных і адсталых бакоў народнага быту лічыўся сапраўдным мастацкім прыёмам.

Нам, людзям, якія стаяць на глебе марксісцкага светапогляду, абсалютна чужыя гэтыя адносіны да народа і гэты паказ народнага характару.

Мы ведаем, што гісторыя ёсць гісторыя барацьбы класаў, мы ведаем, што народ заўсёды і нязменна змагаўся са сваімі прыгнятальнікамі. Мы ведаем, што народу ўласцівы сіла, мужнасць, свабодалюбства, воля да барацьбы і перамогі над сваімі парабашчальнікамі. У аснове характару народа ляжыць глыбокі і гарачы аптымізм, жыццесцвярджаючы пачатак, велізарная сіла і глыбокая мудрасць.

У гэтай сувязі хочацца прывесці адну заўвагу Энгельса, зробленую ім у прадмове да сваёй працы «Сялянская вайна ў Германіі». Ён пісаў:

«... У сваёй барацьбе як з уладамі, так і з буржуа рабочыя заўсёды праяўлялі сваю разумовую і маральную перавагу, паказаўшы ў сваіх сутычках з так званымі «работадацелямі», што цяпер яны, рабочыя, з'яўляюцца адукаванымі людзьмі, а капіталісты — невукамі. Пры гэтым барацьбу яны большай часткай вялі з юмарам, які з'яўляецца лепшым доказам іх упэўненасці ў сваёй справе і ўсведамлення ўласнай перавагі».

Энгельс пісаў гэта ў 70-я годы мінулага стагоддзя і меў на ўвазе германскіх рабочых. Але гэта ўказанне мае метадалагічнае значэнне для правільнай характарыстыкі гісторыі барацьбы народаў супроць сваіх парабашчальнікаў.

Неабходна падкрэсліць і тое, што як у драматургіі, так і ва ўсіх астатніх галінах мастацтваў нам неабходна змагацца за стварэнне сапраўды вялікіх класічных твораў на совецкую тэму. Нам трэба стварыць у мастацтве сапраўдныя вобразы совецкага героя і совецкай гераіні,— такія вобразы, праз якія глядач не праходзіў бы з халоднай абыякавасцю, а якія хвалявалі-б, будзілі велізарнае пачуццё, выхоўвалі ў гледача тыя якасці, якія ўласцівы нашаму гераічнаму народу.

Між тым у радзе выпадкаў мы натыкаемся на абыякавасць да гэтага. Вось, к прыкладу, рэпертуарная лінія Яўрэйскага тэатра, у якім самыя актуальныя тэмы адносяцца самае большае да 70-х год мінулага стагоддзя.

Мы, вядома, не супроць гістарычных п'ес, але ва ўсім гэтым трэба мець лачуццё меры і перавагу аддаваць сёнешняму дню.

Мне здаецца, што нам трэба праложваць далейшае развіццё жанраў драматургіі. Драма і камедыя, трагедыя і добры совецкі вадэвіль,—усё гэта неабходна. Толькі такой разнастайнасцю сродкаў можна выразіць тое багацце адносін, узаемасувязей, якімі так багата наша шматграннае совецкае жыццё.

Мы павінны ісці і па лініі павышэння драматургічных якасцей п'ес.

У гэтым годзе развіццё нашай драматургіі мае асабліва бліскучыя перспектывы: праводзіцца конкурс на лепшую п'есу, у канцы года будзе прысуджацца прэмія імя Сталіна і імя Горкага.

Трэба, каб кожны тэатр быў акружан групай пісьменнікаў-драматургаў, з якімі вялася-б сістэматычная работа.

Наступнае пытанне, якое займае вялікае месца і ў плане работы Упраўлення на 1940 год, гэта пад'яшчэ якасці работ нашых тэатраў.

У рэпертуар нашых тэатраў уключан рад класічных твораў драматургіі: «Рамео і Джульета» Шэкспіра, «Гора ад розуму» Грыбаедава, «Рэвізор» Гогаля. І гэта павышае патрабаванні да актора і рэжысёра.

Нам неабходна правесці творчы агляд тэатральнай моладзі, дапамагчы стварэнню маладзёжных спектакляў.

Клопаты партыі і ўрада ствараюць усе магчымасці для плённай творчай працы работнікаў мастацтваў Совецкай Беларусі. Задача работнікаў мастацтваў—бліскуча прадэманстрыраваць на дэкадзе ў Маскве ўзоры мастацтваў беларускага народа і ў далейшым з новай энергіяй і натхненнем змагацца за стварэнне класічных твораў совецкай эпохі.

Скарочаны запіс даклада на пасяджэнні Мастацкага совета пры Упраўленні па справах мастацтваў.



Гарадскі тэатр у Беластоку. Від зверху.

Фотахроніка БЕЛТА.

ПАВЫСІЦЬ ПАТРАБАВАННІ ДА РАБОТЫ РЭЖЫСЕРА

Выдатных поспехаў беларускае мастацтва дабілася за апошнія годы. Стварэнне новых буйных твораў у музыцы, драматургіі і выяўленчым мастацтве з'яўляецца паказчыкам бурнага росту культуры беларускага народа.

Творчы вынік росквіту беларускага мастацтва будзе падведзен на прадстаячай дэкадзе ў Маскве. Мы з хваляваннем рыхтуемся да прадстаячага агляду. Масква чакае ад беларускага мастацтва паказу рэалістычных спектакляў, авеяных рамантыкай і гераікай барацьбы і перамог беларускага народа.

Значкай з'явай будзе і паказ на дэкадзе фальклорнай народнай оперы кампазітара Туранкова «Кветка шчасця». Наш Оперны тэатр заканчвае сцэнічную работу над гэтай операй, ідуць апошнія рэпетыцыі і хутка опера будзе паказана ўрадавай камісіі і грамадскасці.

Адзначаючы гэтыя поспехі, я хачу ўзняць некаторыя пытанні, звязаныя з далейшым развіццём нашага тэатральнага мастацтва.

Нам, практыкам тэатра, прыходзіцца канстаціраваць, што мы не маем патрэбнай удумлівай крытыкі ўсіх нашых работ. Напрыклад, на спектакль «Міхась Падгорны», выпушчаны ў новай рэдакцыі, было чатыры ці пяць рэцэнзій, але ні адна з іх не можа быць прызнана задавальняючай, бо яны, з аднаго боку, надзвычай падобны адна на другую, а з другога — не аналізіруюць спектакль, а толькі агульна захвальваюць. Нашы акторы і нашы пастаноўкі заслугоўваюць больш уважлівай і сур'ёзнай крытыкі. Неабходна ў рады крытыкаў залучаць вядучых актораў і рэжысёраў нашых тэатраў.

Патрэбна адзначыць і адсутнасць у нашых тэатрах дастатковай колькасці рэжысёраў-педагогаў. Пастаноўшчыкаў шмат, а вось рэжысёраў-педагогаў вельмі і вельмі мала. Усё часцей становіцца бачным у спектаклі пастаноўшчык. Актор для яго толькі повад да вонкавых шуканняў. Мне хочацца ў сувязі з гэтым прывесці выпрымку з пісьма, дасланага мне буйнейшым майстрам і педагогам нашай сцэны народным артыстам СССР Вл. Ів. Неміровічам-Данчэнка. Вось што гаворыць ён аб ролі рэжысёра:

«... Для ролі буйнага рэжысёра яшчэ недастаткова чыста артыстычнага і арганізацыйнага майстэрства. Яшчэ трэба заваяваць маральнае права валодаць душамі людзей, аддадных мастацтву. Заразіцельнасць, тактыка, мудрасць, духоўнае самаўдасканаленне...»

Трэба сказаць, што нам нехапае такіх выхавацеляў. Мала яшчэ ёсць рэжысёраў, якія маюць «маральнае права валодаць душамі людзей»... Гэта сур'ёзная праблема, якая чакае свайго вырашэння.

Пачэснейшай задачай нашага мастацтва з'яўляецца стварэнне совецкіх класічных твораў. І ў сувязі з гэтым трэба сур'ёзна падыйсці да пытання аб тым, як паказваць вобразы совецкіх людзей. Часам мы няправільна падыходзім да паказу асобных нашых герояў і народа. Забываем часам аб самым тыповым, аб абагульваючым характары вобраза на сцэне, і таму часта ўпадаем у антымастацкі натуралізм.

Нам, рэжысёрам, трэба шмат працаваць над сабою. Трэба ўзброіцца тэорыяй марксізма-ленінізма, трэба дабіцца таго, каб нашымі настольнымі кнігамі з'ўляліся творы класікаў марксізма-ленінізма.

І. С. ЗЛАТАГОРАЎ.
Галоўны рэжысёр тэатра оперы і балета БССР.

Больш увагі музыкантам-выканаўцам

У нашай рэспубліцы ёсць выдатныя музыканты - выканаўцы. Напрыклад: лаўрэаты усесаюзных конкурсаў, дацэнты Кансерваторыі — віяланчэліст Власаў і скрыпач Амітон, піяністы Клумаў, Шэршэўскі і іншыя. Аднак, яны вельмі мала альбо амаль зусім не выступаюць. Характэрна, што атрымаўшая прэмію на ўсесаюзным конкурсе вакалістаў Л. В. Руч'ёва пасля свайго канцэрта ў Маскве ў Беларусі не дала ні аднаго канцэрта.

У плане работы Упраўлення па справах мастацтваў на 1940 год пытанне аб росце нашых выканаўчых кадраў і іх канцэртнай рабоце, як у Мінску, так і на перыферыі, павінна займаць пачэснае месца.

Трэба ўказаць і на недастатковую ўвагу беларускіх кампазітараў да малых форм, у прыватнасці, да камерных твораў. Нашым выканаўцам, за выключэннем некалькіх твораў у галіне камернай і інструментальнай музыкі, няма чаго іграць. Вялікім недахопам з'яўляецца амаль поўная адсутнасць твораў беларускіх кампазітараў для скрыпкі, віяланчэлі і фартэп'яна, за выключэннем двух-трох твораў Клумава і Падкавырава.

Вельмі мала ўвагі яшчэ аддаецца і нашым навучальным установам. На працягу многіх год нам ніяк не ўдаецца вырашыць пытанне аб музычнай дзесяцігодцы. Мне здаецца, што Упраўленню з усёй сур'ёзнасцю трэба ў бягучым 1940 годзе заняцца пытаннем падрыхтоўкі нацыянальных музычных кадраў. Музычныя школы ў Беларусі ёсць толькі ў гарадах. У раёнах, у калгасах музычных школ няма. А для таго, каб паступіць у музычныя вучылішчы, патрэбна падрыхтоўка за курс музычнай школы. Дзе-ж таленавітым дзецям калгаснікаў атрымаць музычную адукацыю? Упраўленне па справах мастацтваў у свой план павінна ўключыць, па прыкладу Украіны, Грузіі, стварэнне адной-двух калгасных музычных школ.

М. БЕРГЕР.
Дырэктар Кансерваторыі БССР.

Рэпліка па сутнасці

Некалькі дзён назад быў склікан Мастацкі совет пры Упраўленні па справах мастацтваў пры СНК БССР. Мэтай Мастацкага совета было: абагуліць творчы вопыт і поспехі работнікаў мастацтваў, здабытыя ў мінулым годзе, і на гэтай аснове акрэсліць практычныя задачы Упраўлення па справах мастацтваў і калектываў мастацтваў у справе далейшага развіцця беларускага соцыялістычнага мастацтва.

Пасяджэнне адбылося. Быў заслухан даклад начальніка Упраўлення тав. Азірскага. Пасля даклада выступіла 12 чалавек. Быццам усё, як належыць, але... Але сярод выступаўшых не было ніводнага члена Мастацкага совета. Пад гучнай шыльдай адбылася звычайная вытворчая нарада дырэктараў калектываў мастацтваў. Яны і выступалі, трымалі доўгія прамовы аб выніках уласнай-жа нерасплаадчасці, гаварылі і тонам просьбы і суровага патрабавання, — словам, следавалі дрэннай традыцыі дырэктараў: скардзіцца і патрабаваць. Праўда, на гэтай нарадзе прысутнічала некалькі прадстаўнікоў Мастацкага совета. Але і яны не выказалі ніякай ініцыятывы ў тым, каб пачаць абмеркаванне тых творчых праблем, якія сапраўды патрабуюць сур'ёзнага разгляду на Мастацкім совеце.

І яшчэ цікавая дэталь. Дапусцім, што адбылася нарада дырэктараў. Гэта таксама карысна. Але чаму-ж на такой нарадзе не прагучала ніводнага слова аб безгаспадарчасці, якая існуе ў нашых тэатрах, аб штучна раздутых штатах, аб адсутнасці элементарнай дысцыпліны ў выдаткаванні дзяржаўных сродкаў? Ніводзін з нашых тэатраў не ўзняў яшчэ пытання аб адмаўленні ад дзяржаўных датацый. А наколькі наспела зараз гэта пытанне, яскрава гаворыць адмаўленне ад датацый Акадэмічнага Малага тэатра Масквы і зварот калектыва да ўсіх тэатраў Совецкага Саюза «перайсці з 1940 года на бездатацыйную работу з адначасовым уздымам ідэйнай і мастацкай якасці спектакляў».

Што-ж, урэшце, дала гэтая двухдзённая нарада неакрэсленага характару? Меркаваць, як кажуць, не нам...

На падрыхтоўку да дэкады засталося менш двух месяцаў. Работы-ж яшчэ вельмі і вельмі многа. Тэатр оперы і балета зацягвае выпуск прэм'еры «Кветка шчасця», марудзіць з заканчэннем дапрацоўкі і паказам грамадскасці оперы «Дрыгва» і балета «Салавей». Патрабуюць жадаць лепшага і тэмпы падрыхтоўкі Філармоніяй заключнага канцэрта дэкады, асабліва мастацкага афармлення яго.

І Мастацкі совет абавязан дэталёва прааналізіраваць усю работу па падрыхтоўцы да дэкады, каб не дапусціць недаробак, забяспечыць высокую мастацкую якасць твораў, якія будуць паказаны на дэкадзе.

Наша мастацтва павінна зрабіць рашучыя крокі к дасягненню велічнай мэты— стварэнню совецкай класікі. Гэта пытанне патрабуе ўдумлівай і сур'ёзнай распрацоўкі на Мастацкім совеце.

Выходзячы з задачы барацьбы за класічныя ўзоры совецкага мастацтва, павінны быць акрэслены асноўныя творчыя праблемы і пытанні далейшай практычнай дзейнасці, патрабуючыя прыкладання ўсіх сіл работнікаў мастацтваў.

А над чым будуць працаваць, што новае пакажуць нашы тэатры пасля дэкады? Няма яшчэ патрэбных клопатаў аб стварэнні новых п'ес, опер, пазадэкаднага рэпертуару.

Асабліва-ж адчуваецца недахоп песень, рамансаў, твораў сімфанічных, камерных,—твораў для Філармоніі, для эстрады.

Для эстрады, увогуле, не прывычаіліся яшчэ пісаць ні кампазітары, ні паэты, ні драматургі. Не разбіта шкодная традыцыя разглядаць малыя формы, як мастацтва якогасьці другога гатунку.

Надзвычай вялікай увагі патрабуюць і пытанні выхавання і далейшага росту творчых кадраў нашага мастацтва. Прыцягненне да актыўнай канцэртнай дзейнасці наяўных у нас сіл музыкантаў-выканаўцаў, вакалістаў, клапатлівае выхаванне і больш смелае вылучэнне моладзі—надзённыя справы, якія павінны заняць пачэснае месца ў рабоце Упраўлення.

Аб усім гэтым, меркавалася, скажа сваё важкае слова Мастацкі совет. Але... Але ён павінен яго сказаць! Упраўленне па справах мастацтваў павінна зрабіць Мастацкі совет дзейсным, аператыўным, баявым штабам калектываў работнікаў мастацтваў нашай рэспублікі.

ЮР.

АБ УМОВАХ, НЕАБХОДНЫХ МАЛАДОМУ ТЭАТРУ

Наш малады Гомельскі абласны тэатр уступіў у сям'ю беларускіх тэатраў у перыяд вялікага ўздыму ўсяго мастацтва БССР, у перыяд дзейснай і плённай падрыхтоўкі да адказнага і раднаснага паказу дасягненняў мастацтва беларускага народа ў Маскве.

Калектыў нашага тэатра — гэта група маладых актораў, скончыўшых Маскоўскі тэатральны інстытут па класу народнага артыста СССР Л. М. Леанідава.

Гомельскі глядач ахвотна глядзіць нашы спектаклі. «Рэвізор» прайшоў каля трыццаці разоў і застаецца ў рэпертуары. Зараз з поспехам праходзяць спектаклі «Падзь Сярэбраная» і «Хто смяецца апошнім». Добрыя адносіны гледача не здзіўлялі-б, калі-б мы працавалі ў нармальным тэатральным памяшканні, але калі ўлічыць, што мы працуем у краўляным халодным памяшканні былога цырка, то такая любоў да тэатра становіцца асабліва каштоўнай і дарагой.

Цяжкасці-ж нашай работы далёка не творчыя. У нас няма памяшкання для рэпетыцый, няма падсобнага памяшкання для апрацоўкі дэкарацый, няма цырульніка, бутафора, мастака. З гэтай прычыны мы затрымліваем выпуск прэм'ер, не выконваем вытворчага плана. Падрыхтаваны шэсць месяцаў таму назад спектакль «Чайка» Чэхава, пастаўлены Л. М. Леанідавым, мы дагэтуль не можам выпусціць.

У гэтым нам патрэбна дапамога з боку Упраўлення па справах мастацтваў.

І другая вельмі важная ўмова паспяховай работы маладога тэатральнага калектыва — неабходнасць мець крытыку сваіх работ.

Мы з'яўляемся адзіным тэатрам у Гомелі. Творча спаборнічаць няма з кім. Рэцэнзіі, якія змяшчаюцца ў мясцовай абласной газеце, — гэта альбо пераказ рэцэнзій на тыя-ж спектаклі, змешчаных у другім выданні,—напрыклад, аб «Рэвізоры» рэцэнзент абласной газеты ўзяў усе свае мыслі з артыкула аб гэтым-жа спектаклі ў журнале «Тэатр», — альбо бездапаможная балбатня. Прыклад гэтага — рэцэнзія на спектакль «Падзь Сярэбраная», якая была змешчана ў абласной газеце пасля таго, як спектакль прайшоў 30 разоў. Бездапаможнасць рэцэнзента і неразуменне ім творчага працэсу ў ацэнцы ігры актораў настолькі відавочны, што прыходзіцца толькі здзіўляцца смеласці гэтага чалавека, які бярэцца меркаваць аб рэчах, яму невядомых.

Мы чакаем крытыкі дзелавой, глыбокай, дапамагаючай зразумець нашы памылкі. Каб мець яе, трэба клапатліва вырашчваць кадры крытыкаў.

Першай важнейшай справай у гэтым напрамку, у напрамку вырашчвання крытычных кадраў на перыферыі, могуць з'явіцца курсы-канферэнцыя тэатральных крытыкаў, якую патрэбна склікаць у самы бліжэйшы час.

Е. СОКАЛАЎ.
Мастацкі кіраўнік Гомельскага абласнога тэатра.

ВЫДАТНАЯ БЕЛАРУСКАЯ АКТРЫСА

Вось ужо сапраўды пра каго можна сказаць, што яна нарадзілася і вырасла ў тэатры,—гэта пра Ірыну Ждановіч, пра тую «маленькую» Ірыну, якая ў свой час так бліскуча выконвала ролі травесці на сцэне Дзяржаўнага Беларускага драматычнага тэатра.

Вырасшая ў акторскай сям'і, Ірына Ждановіч 14-ці год ад роду ўжо выступіла ў досыць адказнай ролі хлопчыка Данілкі ў п'есе Янкі Купалы «Раскіданае гняздо».

Шмат іх, хлопчыкаў і дзяўчат, давялося выканаць Ірыне Ждановіч, перш чым яна, так сказаць, вырасла фізічна, —перш чым пачала іграць ролі дарослых. Перыяд работы над вобразамі дзяцей, юнакоў, які займае большую палову двацацігадовага акторскага шляху Ірыны Ждановіч, наклаў выразны адбітак на творчы профіль актрысы. Ён падрыхтаваў яе да выканання такой складанай і адказнай ролі, як Вера ў п'есе Максіма Горкага «Апошнія».

Іменна ўсе тыя акторскія якасці, якія паступова развіваліся ў розных выконваемых Ірынай Ждановіч вобразах хлопчыкаў і дзяўчынак, знайшлі сваё завяршэнне ў дасканалым выкананні ролі юнай Веры.

Глыбіня пачуццяў, празрыстая яснасць думак, сіла першых перажыванняў— усё, што так уласціва юным істотам, з мастацкай выразнасцю выяўляецца Ірынай Ждановіч у вобразе Веры.

Маленькая, мяцежная Вера ўпарта змагаецца за свае ідэалы, за свае мары, але ў сям'і паліцэйскага Івана Каламійцава няма месца для рамантыкі, тут гінуць лепшыя жаданні Веры, гінуць безлітасна, раздаўленыя жудасным жыццём перыяду рэакцыі пасля рэвалюцыі 1905 года.

У гэтай ролі з усёй глыбінёй і сілай раскрылася сапраўднае драматычнае дараванне Ірыны Ждановіч. Яе выкананне ролі Веры глыбока пранікнёнае, яно стаіць на высокім узроўні акторскага майстэрства.



І. Ждановіч.

Сілу драматычнага даравання Ірыны Ждановіч мы бачым і ў выконваемай ёю ролі Галі ў п'есе Біль-Белацэркоўскага «Жыццё кліча» і асабліва ў ролі Марылькі ў п'есе «Бацькаўшчына» Кузьмы Чорнага.

Абедзве яны—і Галя, і Марылька — яшчэ па сутнасці маладыя, але розныя жыццёвыя перажыванні наклалі ўжо на іх свой адбітак, і мы бачым перад сабой двух жанчын з вялікім і складаным унутраным светам.

Цікавую эксперыментальную работу прарабіла Ірына Ждановіч над роляю Ганны ў п'есе «Салавей» Змітрака Бядулі. Вельмі пераканаўча, з добрым мастацкім тактам выконваецца ёю гэта складаная роля маладой прыгоннай сялянкі, якая звар'яцела, не вытрымаўшы панскіх здзекаў над сабой.

У выкананні ролі Майкі ў п'есе Карнейчука «Платон Крэчэт» Ірыне Ждановіч удаецца вельмі добра перадаць сакавіты юмар гэтай маленькай дзяўчынкі, якая вымушана быць гаспадыняй у доме рана аўдавеўшага адказнага працаўніка Берастэ.

Ірына Ждановіч з прывычнай для яе назіральнасцю і знаннем псіхалогіі дзяцей сцэнічна вельмі яскрава перадае тыповыя рысы дзяўчыны-падлетка.

Тонкім адчуваннем пушкінскай лірыкі вызначаецца створаны Ірынай Ждановіч вобраз Машы ў інсцэніроўцы «Капітанская дачка».

За дваццаць год работы ў Дзяржаўным Беларускім драматычным тэатры Ірынай Ждановіч выканана звыш пяцідзесяці самых разнастайных ролей, сярод якіх ёсць такія добра вядомыя нашаму гледачу і станоўча ацэненыя крытыкай вобразы, як Насця ў п'есе Э. Самуйлёнка «Пагібель воўка», Канрад у «Жакерыі» па Мерыме, Жэня ў камедыі Адуева «Як яе завуць» і рад іншых.

Ірына Ждановіч жыве актыўным грамадскім жыццём. У гістарычныя дні вызвалення слаўнай Чырвонай Арміяй працоўных Заходняй Беларусі Ірына Ждановіч разам з акторскай брыгадай абслугоўвала байцоў і насельніцтва на вызваленай зямлі.

Да дваццацігоддзя БССР урад рэспублікі надаў Ірыне Фларыянаўне Ждановіч званне заслужанай артысткі.

Ірына Ждановіч знаходзіцца ў стане свайго акторскага росквіту. Перад ёю шырокае поле мастацкай дзейнасці. Зараз яна працуе над роляю Джульеты ў трагедыі Шэкспіра «Рамео і Джульета». Мы ведаем і пра адну мару актрысы: стварыць выдатнейшы вобраз рускай жанчыны—сыграць ролю Кацярыны ў п'есе Астроўскага «Гроза».

Е. РАМАНОВІЧ.

НАТХНЁНАЕ СЛУЖЭННЕ МАСТАЦТВУ

«Смысл жизни вижу в творчестве».
М. Горкі.

Вясной 1925 года ў Оршы звярнуў на сябе ўвагу гледача малады актор—выканаўца ролі Овада. Ён захапляў гледача сваім тэмпераментам, лірычнай задушэўнасцю. Гэта вылучала яго сярод астатніх актораў паўпрафесіянальнага калектыва рускай драмы. Цікавасць да новага актора ўзрастала з кожным спектаклем...

На адным з спектакляў выканаўца Овада паведамілі, што паглядзець на яго прыйшлі госці — акторы з Беларускага тэатра. Знаёмства з імі адкрыла новыя перспектывы для маладога актора.

Неўзабаве ён увайшоў у калектыў Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра.

Так пачалося творчае жыццё заслужанага артыста БССР Міхаіла Абрамавіча Зорава. Першым настаўнікам М. А. Зорава ў Беларускім драматычным тэатры з'яўляецца вопытны майстар сцэны Е. А. Міровіч. Ён дапамог маладому актору знайсці правільны шлях да майстэрства, якое заложана ў глыбокай, удумлівай творчай вучобе і сур'ёзнай рабоце над сабою.

На сцэне Беларускага драмтэатра М. А. Зораў вырас, як цікавы майстар сцэны з яскрава акрэсленай творчай індывідуальнасцю, які стварыў галерэю незабыўных вобразаў.

Мяккай усмешкай, юмарам афарбоўвае ён вобраз рэвалюцыянера-падпольшчыка Евеля Цывіна. За яго спакойнай стрыманасцю, за лагоднай і ветлівай усмешкай, лірычнай мяккасцю і разам з тым войстрай іроніяй адчуваецца ўнутраная сіла волі, цвёрдасць перакананага рэвалюцыянера. Гэта не схема, а сапраўдны вобраз камуніста.

Хто не памятае таленавітага спектакля «Платон Крэчэт», у якім Зораў паспяхова спалучыў сваё майстэрства актора з рэжысёрскай работай.

У ролі Платона Крэчэта мы бачылі Зорава не толькі, як рэалістычнага актора, але і актора з вялікім драматычным пафасам. Платон Крэчэт—Зораў чалавек высокіх пачуццяў і таленту, з мяккай лірычнай душой, у якім ярка адлюстраваны характэрныя рысы героя нашага цудоўнага часу.



М. Зораў.

Зусім процілеглы па свайму характару і светапогляду вобраз стварыў М. А. Зораў у спектаклі «Салавей»,—вобраз ксяндза,—вернага прыслужніка сваіх гаспадароў—польскіх паноў.

Свой акторскі вопыт і майстэрства М. А. Зораў з поспехам рэалізуе ў рэжысёрскай рабоце, ажыццявіўшы пастаноўку такіх спектакляў, як «Працяг будзе» А. Бруштэйн, «Платон Крэчэт» А. Карнейчука, «Кацярына Жарнасек» М. Клімковіча, «Апошнія» М. Горкага і інш.

Актору вельмі лёгка працаваць з рэжысёрам М. А. Зоравым, які добра ведае псіхіку актора. Ён ніколі не адміністрыруе ў часе работы над спектаклем, а беражліва дапамагае актору знайсці патрэбныя фарбы для таго ці іншага вобраза. У цяжкія мінуты работы актора над роляй Зораў, як чулы педагог, умела дапамагае актору «знайсці сябе».

Я асабіста заўсёды з задавальненнем успамінаю рэпетыцыйную работу Зорава над спектаклямі «Працяг будзе» і «Музыканцкая каманда», якая ператваралася ў самыя дарагія, жаданыя для кожнага актора хвіліны.

Спектаклі Зорава—гэта спектаклі мастацкай праўды і глыбокага лірызма.

М. А. Зораў у супрацоўніцтве з выдатным майстрам рускай сцэны І. М. Раеўскім стварыў выдатны горкаўскі спектакль «Апошнія».

Гэты спектакль з'яўляецца як-бы вяршыняй акторскай і рэжысёрскай творчасці М. А. Зорава.

М. А. Зораў уклаў у гэту сваю працу ўвесь свой талент, усё сваё сэрца мастака, дзякуючы чаму спектакль «Апошнія» так ярка і поўнакроўна ўзнаўляе горкаўскія вобразы, паказвае свет маральна разлажыўшыхся, адпіваўшых людзей, свет «апошніх» дваранскай Расіі. У «Апошніх» знайшла сваё адлюстраванне ўся гніль і нікчэмнасць царскага самаўладдзтва, непазбежнасць яго гібелі.

Гэты спектакль заслужана стаіць у радзе лепшых твораў беларускага мастацтва, вызначаных для паказу ў сталіцы нашай соцыялістычнай радзімы ў Маскве.

З поспехам М. А. Зораў спалучае сваю работу рэжысёра і актора з педагагічнай работай у Рэспубліканскім тэатральным вучылішчы, дзе выхоўвае маладую акторскую змену.

У Беларускім драмтэатры М. А. Зораў рыхтуе спектакль «Не было ні гроша, а раптам алтын» А. Астроўскага, у якім галоўныя ролі будуць выконваць маладыя акторы. Гэты спектакль прысвечан рэспубліканскаму агляду творчасці тэатральнай моладзі.

М. А. Зораў любімай справе—тэатру— аддае ўсе свае сілы, увесь свой талент.

ВЛ. СТЭЛЬМАХ.



Сектар дзіцячай літаратуры Дзяржвыдавецтва БССР падрыхтоўвае да друку аповесць Алейнікава «Кры-кры». **НА ЗДЫМКУ:** малюнкі мастака В. М. Бэсаза для беларускага выдання аповесці.

ПЕСНІ ДЛЯ ЗАКЛЮЧНАГА КАНЦЭРТА ДЭКАДЫ

Надыходзячая дэкада беларускага мастацтва ў Маскве паставіла перад работнікамі мастацтваў БССР рад складанейшых задач.

Пачэсная задача выпала на долю беларускіх кампазітараў—стварыць новыя творы для заключнага канцэрта дэкады.

У першую чаргу ўстала пытанне аб стварэнні песні аб Сталіне, песні «Прывет Маскве», якой адкрыецца заключны канцэрт, і стварэнне песні, завяршаючай праграму.

Урадавая камісія і Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР арганізавалі конкурс на стварэнне гэтых песень. Цяпер, калі пасля падага раду тураў песні адабраны, мы можам зрабіць кароткі агляд іх.

Асноўныя патрабаванні, пастаўленыя перад кампазітарамі, былі: народнасць, масавасць, напеўнасць і выразнасць. Патрабаванні вельмі сур'ёзныя. І не ўсе кампазітары, прыслаўшыя свае творы на конкурс, улічылі як след гэтыя патрабаванні, таму камісіі прыйшлося рад твораў адхіліць, як не адпавядаючыя патрабаванням конкурса.

Усяго на конкурс паступіла 32 песні. З песень аб таварышу Сталіне ўхвалена камісіяй песня кампазітара Н. І. Аладава на тэкст А. Русака («Хто ты, веліч бязмерная»).

Гэта песня заслужана атрымала аднадушную ўхвалу камісіі і выканаўцаў. Песня мэтанакіраваная, блізкая да народных твораў, вельмі выразная.

З песень «Прывет Маскве» ўключана ў праграму заключнага канцэрта песня тав. Шчэглова на тэкст Броўкі. Гэта песня вельмі жыццёрадасная і яркая.

Камісіяй таксама ўхвалена песня «Прывітанне Маскве» (тэкст Клімковіча) кампазітара Палонскага. Гэта песня слабей за папярэднюю па сваёй дынамічнасці, яна больш спакойнага, эпічнага складу, не такая яркая, але ўсё-ж безумоўна валодае меладычнымі вартасцямі.

Кампазітар Е. К. Цікоцкі напісаў цікавую, блізкую да народных напеваў песню «Падзяка Сталіну». Гэта песня выконвалася самадзейнымі харавымі калектывамі на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.

Арыгінальную песню аб таварышу Сталіне з ярка выражаным фальклорным характарам напісаў кампазітар Сакалоўскі. Гэта песня безумоўна будзе падхоплена калгаснай самадзейнасцю.

Песня кампазітара Залатарова «Прывітанне Маскве», валодаючы безумоўнымі музыкальнымі вартасцямі, зможа ўвайсці ў рэпертуар харавых гурткоў, як бадзёрая маршавая песня.

Нядрэнную песню напісаў кампазітар Г. Пукст («Прывітанне Маскве»).

Кампазітар А. Е. Туранкоў напісаў песню аб Сталіне, якая безумоўна ўвойдзе, дзякуючы сваёй меладычнасці, у рэпертуар самадзейных хораў.

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР мяркуе ў бліжэйшы час выпусціць зборнік, у які ўвойдуць песні, уключаныя ў праграму заключнага канцэрта, а таксама песні, ухваленыя камісіяй як заслугоўваючыя ўвагі нашага слухача. Выпуск гэтага зборніка можна толькі вітаць, бо ён з'явіцца вельмі каштоўным укладам ў рэпертуар нашых хораў.

І. БАРЫ.

НАПЯРЭДАДНІ ЮБІЛЕЯ П. І. ЧАЙКОЎСКАГА

7 мая спаўняецца 100 год з дня нараджэння вялікага рускага кампазітара П. І. Чайкоўскага. Дзяржаўная Кансерваторыя БССР рыхтуецца адзначыць гэтую дату выкананнем раду твораў Чайкоўскага.

Студэнты Кансерваторыі і музвучылішча з вялікім энтузіязмам рыхтуюць да юбілея оперу «Еўгеній Онегін». Пастаноўка оперы Чайкоўскага з'явіцца адначасова пробай сіл маладога калектыва. У пастаноўцы прымаюць удзел хор у складзе 40 чал., аркестр у складзе 45 чал., дзесяткі маладых салістаў. Партыі рыхтуюць: Онегіна — студэнт III курса комсамолец Еўраеў, Ленскага — студэнты Шульга, Гарэлік, Альбірт (нядаўна паступіў у Кансерваторыю ў ліку студэнтаў заходніх абласцей БССР). Тацяны — студэнтка IV курса Купцэвіч, Ольгі — комсамолка Айзенберг (заканчвае Кансерваторыю ў гэтым годзе і прынята ўжо на работу ў Тэатр оперы і балета).

Ставіць оперу рэжысёр І. С. Златагораў, хормайстар — Шварц, дырыжор—Балазоўскі. Агульнае кіраўніцтва ажыццяўляе прафесар Шперлінг.

Спектакль абяцае быць вельмі цікавым, калі ўлічыць, што будуць выступаць маладыя выканаўцы, якія спрабуюць свае сілы ў такім вялікім і складаным творы.

Апрача пастаноўкі оперы «Еўгеній Онегін», усе кафедры Кансерваторыі рыхтуюць рад камерных твораў. Сіламі прафесарска-педагагічнага складу будуць дадзены два камерных канцэрты з твораў Чайкоўскага. Вялікі канцэрт з твораў Чайкоўскага рыхтуе аркестравы клас Кансерваторыі пад кіраваннем прафесара Мусіна. У праграму ўключаны: 5-я сімфонія, часткі з оперы «Снягурачка», адна частка скрыпічнага канцэрта ў выкананні студэнта Адліванкіна, фартэп'янны канцэрт у выкананні студэнта Паляводы і інш.

Навуковы работнік Кансерваторыі тав. Смольскі працуе над нарысам аб «Манфрэдзе» Чайкоўскага.

Цімох КРЫСЬКО

Белыя вершы

1. Марозным днём

Чырвоны эшалон ідзе на поўнач.
Мінаюць сёлы, гарады, раз'езды.
А я чакаю ўсё той станцыі ў прысадах,
Што ў марах стала мне прытулкам
родным.
Чакаю хвілі той, калі ў белым вецці
Мільгне ружовая хусціна, —
Оля!
Ты кожны эшалон, ты кожны поезд
Выходзіш сустракаць:
— Шчаслівае дарогі!

Шчэ дзеці спяць. Не будзем іх трывожыць,
І мы гады прыгожыя успомнім.
Прасторны дзень.
І граюць, граюць сосны,
Напятыя між небам і зямлёю,
Як струны вечнае віяланчэлі,
І вецер
Не ўпраўляецца нацерці смык жывіцай.

Мы — дзеці.
От шчыглы на леташні дзядоўнік
Чародкай шуганулі.
Не палохай.
Хутчэй сіло! Мы ўсіх іх пераловім!
Мы ўсе сады суседскія абойдзем,
І высачым заяччы цёплы след...

Гудок. Пара.
Не, мы не дзеці.
Не лятуценнікі наіўныя —
Бацькі.
І за спакой дзяцей
За іх жыццё, за шчасце
Нам давядзецца мо' аддаць ўсю кроў
да кроплі.

І я мо' не вярнуся, пустадомак.
Ты ім, як вырастуць, пра гэты дзень
успомні,
І навучы любіць зіму, шчыглоў, сініц,
І слухаць, як над светам ў час пагодні
Сасновая віяланчэль звініць.

2. Водгулле

Тваё імя я назаву —
І водгулля абруч
Пакоціцца праз пушчы, праз палеткі
Да дому ціхага твайго,
Сцяжынкай дарагой,
Дзе голас мой падхопяць птушкі ў ліпах.

І ластаўкай ляціць
З ім сэрца юнака,
Каб прынясці ў адказ цяпло тваёй усмешкі.

І коціцца абруч,
Мінаюць вёрсты, дні,
А я ўсё радуюся гульням беспклапотным.

3. Думка

Бывае, ліст прысохне да кары —
Не адарваць вятрам, ні навальніцам,
Калоціцца, трасецца разам з дрэвам,
І горнецца да спуджанай галіны.
Пажоўкнуць ўсе, і абляцяць на зямлю,
А ён трымціць, і туліцца, і ліпне...

А быў-бы я лістом, і я трымцеў-бы,
Хапаўся-б за кару, за вецце,
Бо крыўдна-ж доле гінуць і гніці.
Хоць перажыў усіх, празеляне ўсё лета.

Зерняці я зайздрошчу. Паглядзі,
Як рада яно буры! — ўпасці, упасці,
Каб новым нарадзіцца дрэвам,
І зноў пад ясным сонцам выспяваць.

4. Бяссмерце

«Загіну у баі — лічыце комуністам».
І гінулі.
А мужнасць развінала сцяг непераможны.
Раслі рады.
То ў цяжкую хвіліну
Узнімалася, як акіян, душа народа,
І хвалі гневу білі ў берагі,

І кроў герояў ажывала ў сэрцах,
Рукам давала сілу, меткасць зброі,
І Кіраў уставаў у грозных танках,
У крэйсерах,
У песнях,
У бяссмерці.

Саколка, люты 1940 г.

Першы спектакль у Польскім Дзяржтэатры БССР

13 сакавіка трагедыяй Ф. Шылера «Каварства і любоў» у пастаноўцы рэжысёра Аляксандра Венгерка адкрыўся ў Гродне Польскі дзяржаўны тэатр БССР. Спектакль прайшоў з вялікім поспехам.

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР у спецыяльным загадзе адзначыла, што спектакль «Каварства і любоў» у Дзяржаўным польскім драмтэатры з'яўляецца вельмі ўдалай работай. Падрыхтаваны ў сціслыя тэрміны, спектакль — высокакультурны, мастацкі, правільна раскрывае вобразы шылераўскай трагедыі.

Адзначыўшы добрую работу тэатра, Упраўленне па справах мастацтваў абвясціла падзяку пастаноўшчыку — рэжысёру тэатра А. В. Венгерка, усяму мастацкаму і тэхнічнаму персаналу тэатра.

Зараз тэатр рыхтуе камедыю польскага класіка Ал. Фрэдра «Пажыццёвае». Рэжысёр А. Венгерка. Прэм'ера адбудзецца ў канцы сакавіка.

Да 1 мая тэатр мяркуе паставіць «Аптымістычную трагедыю» Вішнеўскага ў перакладзе Бойе. Рэжысёр В. Чэнгеры.

У Рускім драмтэатры БССР

12 сакавіка Дзяржаўны рускі драмтэатр БССР паказаў у Віцебску сваю чарговую прэм'еру «Сабака на сене» Лопе дэ Вега ў пастаноўцы маладога рэжысёра В. Я. Міроўскага. Першымі праглядзелі спектакль дэлегаты Віцебскай абласной партканферэнцыі. Спектакль прайшоў з вялікім поспехам.

Зараз тэатр рыхтуе тры спектаклі: «Казку» Светлова, «Мяцель» Леонава і «Крэмлёўскія куранты» Пагодзіна. У ролі Уладзіміра Ільіча Леніна (у п'есе «Крэмлёўскія куранты») выступіць засл. арт. рэсп. Д. А. Орлоў.

6 мая тэатр канчае свае трохмесячныя гастролі ў Віцебску і выязджае ў Беласток, дзе прабудзе да сярэдзіны чэрвеня. З Беластока тэатр прыедзе на гастролі ў Мінск, дзе пакажа свае новыя работы.

Восенню тэатр прыступіць да работы над двума лепшымі класічнымі п'есамі— «Многа шуму з нічога» Шэкспіра і «Сірано дэ Бержэрак» Растана.



Да 15-годдзя савецкага радыёвяшчання. На здымку: Нар. арт. БССР Г. Глебаў і артыстка Беларускага радыёкамітэта Е. Зейдліц ля мікрафона ў часе дзіцячай перадачы.

Фотахроніка БЕЛТА.

Я. М. КРУГЕР



У дні, калі ўся мастацкая грамадскасць Беларусі з небывалым уздымам рыхтуецца да паказу свайго мастацтва на дэкадзе ў Маскве і на прадстаячай мастацкай выстаўцы «Ленін і Сталін— арганізатары беларускай дзяржаўнасці», мы страцілі аднаго з старэйшых мастакоў — заслужанага дзеяча мастацтваў Якава Маркавіча Кругера.

Ён разам з намі актыўна рыхтаваўся да паказу выяўленчага мастацтва Беларусі.

Апошнія годы творчасці Якаў Маркавіч прысвяціў рабоце над вобразам правадыра народаў І. В. Сталіна. Тэма яго апошняй карціны—«Сталін слухае даклад». Вось што неаднаразова пісаў і гаварыў сам мастак: «Да работы над партрэтам Сталіна я звяртаюся зноў і зноў. Мне, як мастаку, дастаўляе вялікую творчую радасць вывучаць і ілюстраваць рысы вялікага чалавека—нашага правадыра, тварца Вялікай Канстытуцыі, тварца свабоды і шчасця, вялікага друга беларускага народа, стваральніка беларускай дзяржаўнасці».

Партыя і Ўрад высока ацанілі працу Я. М. Кругера ўзнагароджаннем яго Пачотнай граматай, а ў азнаку 70-годдзя з дня нараджэння і 45-годдзя творчай дзейнасці—наданнем яму звання заслужанага дзеяча мастацтваў БССР.

Жыццёвы і творчы шлях Якава Маркавіча неад'емна звязан са слаўнымі імёнамі асновапаложнікаў дарэвалюцыйнага рэалістычнага мастацтва Беларусі—мастакамі Ю. М. Пэнам, Л. А. Альперовічам і інш. Шлях мастака быў жорсткі і цяжкі ва ўмовах дарэвалюцыйнай Беларусі— адсталай і прыгнечанай калоніі рускага царызма.

Якаў Маркавіч нарадзіўся ў Мінску ў маі 1869 года ў беднай сям'і. З маленства былі выяўлены схільнасці яго да рысавання. Бацькі імкнуліся развіць яго талент, але вучыцца яму ў той час не было ў каго. Яго аддалі ў рэмесленае вучылішча, дзе ён і атрымаў першапачатковую адукацыю. Чатырнаццацігадовым хлопчыкам ён нарысаваў партрэт І. С. Тургенева. Гэта першая работа звярнула на яго ўвагу дырэктара Мінскай гімназіі, пры садзейнічанні якога будучы мастак быў накіраван у Кіеўскую мастацкую школу Мурашка, дзе праявіў сябе здольным вучнем, атрымліваў за добрыя поспехі ў галіне рысунка і жывапісу ўзнагароды і пахвалы, адначасова павышаў свой агульнаадукацыйны ўзровень на курсах.

Пасля сканчэння Кіеўскай мастацкай школы, у 1886 годзе, Якаў Маркавіч едзе ў Пецербург, жадаючы паступіць у Акадэмію мастацтваў, але царскія чыноўнікі, якія кіравалі Пецербургскай Акадэміяй мастацтваў, не пажадалі прыняць яго з-за адсутнасці права жыхарства ў Пецербургу. Ён прымушан быў вярнуцца ў Мінск. З Мінска едзе ў Варшаву, дзе нядоўгі час працуе ў праф. Гаравіц, а ў 1888 годзе едзе ў Парыж, дзе атрымлівае мастацкую адукацыю ў Акадэміі Жульен.

У 1895 годзе Я. М. Кругер вяртаецца з-за граніцы ў Расію, зарэкамендаваўшы сябе таленавітым мастаком. Пры садзейнічанні вялікага майстра рускага жывапісу І. Е. Рэпіна Якаву Маркавічу ўдаецца паступіць у Пецербургскую Акадэмію мастацтваў, якую ён і скончыў у 1900 годзе, атрымаўшы званне мастака за конкурсную карціну «На суд прафесара».

Па сканчэнні Акадэміі Якаў Маркавіч вяртаецца ў свой родны Мінск, дзе цалкам прысвячае сябе мастацкай і педагагічнай дзейнасці.

Дзякуючы нястомным намаганням мастака ў Мінску была адкрыта мастацкая школа, у якой першымі вучнямі былі настаўнікі рысавання, аматары, а таксама прышоўшая з мястэчак і вёсак даравітая моладзь.

Я. М. Кругер арганізаваў таксама ў Мінску таварыства мастакоў, але асярод-дзе, у якім знаходзіўся Якаў Маркавіч, не спрыяла замыслу мастака. Царскі рэжым і паліцэйскае свавольства абмяжоўвалі яго творчыя магчымасці.

Якаў Маркавіч ствараў карціны і партрэты з жыцця блізкага яму працоўнага яўрэйскага насельніцтва Беларусі. У гэтыя работы ён укладваў усе свае веды, усё ўменне мастака.

Да лепшых работ гэтага перыяду можна аднесці выдатна напісаны маслам партрэт скрыпача Жухавіцкага, блізкага друга і прыхільніка мастака. Выканан ён з вялікім майстэрствам па мадэліроўцы формы, колеру і характару. Да гэтай серыі трэба аднесці «Аўтапартрэты», «Партрэт доктара Шапіра з віяланчэллю», «Мужчынскі партрэт» і інш.

З няменшым майстэрствам Якаў Маркавіч валодаў тэхнікай пастэлі. Да работ, выкананых гэтымі матэрыяламі, адносяцца «Партрэт жонкі», «Партрэт М. Грэдзінгер», «Партрэт жанчыны» і інш.

На ўсіх гэтых работах адчуваецца ўплыў традыцый школы перадвіжнікаў.

Спробы мастака працаваць над глыбокімі тэматычнымі карцінамі, якія раскрываюць сацыяльны і нацыянальны гнёт, цярпелі няўдачы,—напрыклад, карціна «Пагром» была знішчана царскімі жандарамі.

У сваіх успамінах Якаў Маркавіч піша: «Як мастак, я працаваў у тыя змрочныя годы не плённа. Прыгнятала абстаноўка паліцэйскага свавольства, гвалту».

Якаў Маркавіч, як мастак-гуманіст і дэмакрат па перакананню, усім сэрцам вітаў Вялікую Кастрычніцкую сацыялістычную рэвалюцыю, якая дала новыя сілы, натхніла яго на новыя дзярзанні. Таксама, як Ю. М. Пэн у Віцебску, Я. М. Кругер у Мінску ўсёй сваёй творчасцю служыў народу. Пачынаючы з 1921 года, Якаў Маркавіч разам з групай мастакоў—Елісеевым, Палазавым і інш.—ездзіў у камандыроўкі для збірання краязнаўчага матэрыялу і зарысовак па заданню музея.

Адначасова на працягу многіх год ён працаваў настаўнікам рысавання ў школах і рабфаках Мінска, кіраваў мастацкімі гурткамі, прывіваючы тым самым любоў да мастацтва і мастацкую ку[illegible] падрастаючаму пакаленню.

Па лініі творчасці Кругерам напісаны партрэты вучоных, паэтаў, пісьменнікаў, партрэт Сцяпана Разіна, партрэт Пугачова, партрэт Я. Коласа, партрэт пісьменніка Абрамовіча (Мендэле Мойхер-Сфорым), З. Бядулі і інш. З вялікай любоўю Якаў Маркавіч працуе над партрэтамі геніяў рэвалюцыі Маркса, Леніна, Сталіна, над партрэтамі Варашылава, М. Горкага.

Мастак актыўна працуе над актуальнымі тэмамі, звязанымі з сацыялістычным будаўніцтвам у БССР.

На індустрыяльныя тэмы ім напісана карціна «Кавальскі цэх завода імя Кірава ў Мінску», над якой ён шмат працаваў, робячы рад дакладных зарысовак.

У апошнія годы Якаў Маркавіч шмат працаваў над партрэтамі герояў-пагранічнікаў, сцвярджаючы сябе на мастацкай арэне больш за ўсё мастаком-партрэтыстам.

Акрамя таго, Якаў Маркавіч шмат працаваў у якасці мастака-карэспандэнта раду газет і быў актыўным удзельнікам усіх усебеларускіх мастацкіх выставак.

На працягу ўсяго свайго творчага шляху Якаў Маркавіч заставаўся верным традыцыям рускага рэалістычнага мастацтва.

Выдатна жыццё Якава Маркавіча Кругера, яго выключная працаздольнасць, глыбокая і беззаветная любоў да мастацтва. Да апошніх дзён свайго жыцця не пакідаў ён кісці і палітры, жывучы вялікімі ідэямі творчасці, яўляючы для моладзі прыклад служэння сваёй творчасцю вялікаму савецкаму народу.

Н. ТАРАСІКАЎ.
М. МАНАСЗОН.

ЗМАГАЦЦА ЗА ВЫСОКУЮ ЯКАСЦЬ МАСТАЦКАГА РАДЫЁВЯШЧАННЯ

Уладзімір Ільіч Ленін надаваў велізарнае значэнне радыё ў справе сацыялістычнага будаўніцтва, ён прадракаў вялікую будучыню радыё. У пісьме да Бонч-Бруевіча 5 лютага 1920 года Ленін пісаў: «Газета без паперы і без адлегласці, якую вы ствараеце, будзе вялікай справай». Ленін і Сталін з'яўляюцца непасрэднымі натхніцелямі і арганізатарамі савецкага радыёвяшчання, якое паспяхова развіваецца ў нас на працягу 15 год.

Наша краіна пакрылася вялікай колькасцю радыёстанцый, густой і магутнай радыёвяшчальнай і прыёмнай сеткай. Прадраканні В. І. Леніна поўнасцю ажыццявіліся: радыё стала сапраўдным мітынгам мільёнаў, радыё моцна ўвайшло ў быт савецкага народа, як неад'емная частка сацыялістычнай культуры. Радыёвяшчанне ў руках бальшавіцкай партыі і савецкага ўрада з'яўляецца магутным сродкам бальшавіцкай прапаганды і агітацыі, выхавання мас у духу комунізма.

У Беларускай ССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, паспяхова развіваецца радыёвяшчанне.

Выдатныя творы класічнай спадчыны, лепшыя ўзоры савецкага мастацтва штодзённа выконваюцца па радыё.

У рэпертуары Беларускага радыёкамітэта ёсць мантажы опер: «Руслан і Людміла» Глінкі, «Еўгеній Онегін» Чайкоўскага, «Капітанская дачка» Кюі, «Гейша» Джонса, «Цыганскі барон» Штрауса, «Лізетта і Філідор» Оффенбаха, рад сімфанічных і камерных твораў, у тым ліку і творы савецкіх кампазітараў: Шастаковіча, Пракоф'ева, Шэбаліна, Дунаеўскага і іншых.

Нашаму радыёслухачу вядомы такія літаратурна-музычныя кампазіцыі, як «Крэйцэрава саната» Талстога, «Гора ад розуму» Грыбаедава, «Майская ноч» Гогаля, «Палтава» Пушкіна ў перакладзе на беларускую мову Я. Коласа, «Дзяўчына і смерць» Горкага, «Добра», «Ленін» Маякоўскага, беларуская народная паэма «Тарас на Парнасе», «У зялёнай дуброве» Куляшова, «Кацярына» Броўкі, «У тыя дні» Глебкі, творы Я. Купалы і Я. Коласа.

Непасрэдна па заданню Радыёкамітэта беларускія савецкія кампазітары Туранкоў, Багатыроў, Палонскі, Любан, Іваноў, Пукст, Равенскі, Цікоцкі, Крошнер напісалі музыку да такіх папулярных твораў беларускага мастацтва, як «Пісьмо беларускага народа вялікаму Сталіну», «Правадыру і радзіме», «12 песень аб непераможнай Чырвонай Арміі», «Граніца ў песнях».

Выдатныя творы беларускіх кампазітараў, як оперы «Міхась Падгорны» Цікоцкага, «У пушчах Палесся» Багатырова, «Кацярына» Шчэглова, «Кветка шчасця» Туранкова, музыка да балета «Салавей» Крошнера, сімфанічныя і камерныя творы Залатарова, Аладава, Туранкова, Цікоцкага, Багатырова, Пукста, Шчэглова, Падкавырава, Самохіна,—сістэматычна транслірующца па радыё.

У радыёвяшчанні творча выраслі кадры выканаўцаў. Адзін з старэйшых работнікаў Белрадыёкамітэта Н. Н. Вастокаў з'яўляецца ўдумлівым і сур'ёзным выканаўцам. У яго рэпертуары побач з складанымі паліфанічнымі творамі Баха, рамантычнымі песнямі Шуберта, Шумана, творамі Глінкі, Мусаргскага, Чайкоўскага вялікае месца займае творчасць беларускіх кампазітараў: Цікоцкага, Шчэглова, Туранкова і інш.

Творчы рост і шлях лаўрэата Усесаюзнага конкурса вакалістаў Л. В. Ручёвай непарыўна звязан з яе работай у Радыёкамітэце. Будучы яшчэ студэнткай Кансерваторыі, Ручёва пачала працаваць у радыёвяшчанні і тут творча вырасла.

Беларускі радыёкамітэт вырасціў рад мастацкіх калектываў: аркестр народных інструментаў (дырыжор Клаус); хор (дырыжор Мілош); вакальны квартэт у складзе артыстаў В. Некрасава, Н. Швайко, Н. Цігулеўскага, Н. Вастокава; дзіцячы самадзейны хор у складзе 95 школьнікаў пад кіраваннем Леўчэнка.

У канцэртах і перадачах Радыёкамітэта прымаюць удзел лепшыя майстры беларускага мастацтва. Сістэматычна выступаюць па радыё народная артыстка БССР Александроўская, заслужаныя артысты БССР Аляксеева, Друкер, Млодэк, Балоцін, Дзянісаў, Мурамцаў, Бяссмертны, лаўрэаты усесаюзных конкурсаў Амітон, Власаў, дацэнты Кансерваторыі: Шэршэўскі, Клумаў, сімфанічны аркестр, ансамбль песні і пляскі і цымбальны аркестр Філармоніі.

Вядучыя артысты Драматычнага тэатра актыўна ўдзельнічаюць у літаратурна-драматычным вяшчанні. Па радыё праводзіцца спецыяльны цыкл перадач у сувязі з прадстаячай дэкадай беларускага мастацтва ў Маскве. З творчымі справаздачамі выступілі народныя артысты БССР Уладамірскі і Глебаў, заслужаныя артысты БССР Ржэцкая і Жданович; рыхтуюцца да творчых справаздач па радыё заслужаныя артысты БССР Рахленка, Платонаў, Грыгоніс, Бірыла і інш.

Сістэматычна выступаюць перад мікрафонам з мантажамі сваіх лепшых спектакляў калектывы нашых дзяржаўных тэатраў — Беларускага драматычнага, Яўрэйскага і Дзіцячага.

Вялікае месца ў мастацкім вяшчанні Беларускага радыёкамітэта займае паказ народнай творчасці і мастацкай самадзейнасці. Лепшыя калектывы мастацкай самадзейнасці заводаў, фабрык, калгасаў, чырвонаармейскіх часцей дэманструюць па радыё свае творчыя дасягненні і поспехі. Радыёслухачам добра вядомы таленавітыя калектывы самадзейнага мастацтва — ансамбль песні і пляскі Хойніцкай МТС пад кіраваннем Лявіцкага, рэчыцкі калгасны хор пад кіраваннем Лапацінай, ансамбль песні і пляскі пагранвойск НКВД і новасфарміраваныя калектывы мастацкай самадзейнасці: зводны хор беластоцкага Дома народнай творчасці, слонімскія калектывы мастацкай самадзейнасці і многія іншыя калектывы і выканаўцы.

Зараз Радыёкамітэт рыхтуецца да юбілея Маякоўскага і Чайкоўскага. У першых лічбах красавіка намечана правесці радыё-вечар «Маякоўскі ў перакладах беларускіх паэтаў». Ля мікрафона выступяць беларускія паэты з чытаннем выбраных твораў Маякоўскага ў перакладзе на беларускую мову.

Праводзіцца цыкл перадач да стагоддзя з дня нараджэння геніяльнага рускага кампазітара Чайкоўскага. У гэты цыкл уваходзяць яго сімфанічныя творы (шэсць сімфоній, «Манфрэд», сімфанічныя паэмы «Рамео і Джульета» і «Францэска да Рыміні»), камерная музыка (тры квартэты, трыо, рамансы, фартэп'янныя творы). Артысты Беларускага радыёкамітэта рыхтуюць оперу «Іоланта», якая ўпершыню будзе выканана ў БССР, мантаж оперы «Мазепа» па Пушкіну, урыўкі з малавядомых опер «Арлеанская дзева», «Чараўніца», «Чаравічкі». Большасць гэтых канцэртаў будуць суправаджацца ўступнымі гутаркамі пра творчасць Чайкоўскага.

У сваіх шматлікіх пісьмах радыёслухачы дзеляцца з работнікамі радыё сваімі ўражаннямі, справядліва крытыкуюць вялікія недахопы мастацкага вяшчання Радыёкамітэта. Слухач вырас, і яго часта не задавальвае якасць перадач.

Радыёкамітэт да гэтага часу не змог узбагаціць свой рэпертуар арыгінальнымі, спецыяльна напісанымі для радыё творамі. Круг выканаўцаў у мастацкім вяшчанні Радыёкамітэта павінен быць пашыран. Трэба ўзбагаціць тэматыку перадач, часцей выконваць творы класічнай спадчыны.

Неабходна стварыць вакол мастацкага вяшчання аўтарскі актыў.

Пытанне аб прыцягненні высокакваліфіцыраваных аўтараў да работы ў мастацкім вяшчанні Радыёкамітэта—адно з асноўных у справе ўздыма якасці вяшчання.

Мастацкае вяшчанне Беларускага радыёкамітэта знаходзіцца яшчэ не на належнай вышыні. Якасць перадач мастацкага вяшчання не заўсёды задавальвае культурна ўзрошага радыёслухача. І таму барацьба за высокую якасць радыёперадач з'яўляецца цэнтральнай і асноўнай задачай работнікаў вяшчання.

Высокаідэйных, высокамастацкіх перадач законна патрабуе наша шматмільённая радыёаўдыторыя.

Ц. БАТВІННІК, В. ГІТЛІЦ.

„Універсітэт музыкальнай культуры"

Дзяржаўная Кансерваторыя БССР арганізавала рад канцэртаў з цыкла «Універсітэт музыкальнай культуры». Мэта гэтых канцэртаў — азнаёміць слухачоў з лепшымі ўзорамі камернай музыкі, як заходне-еўрапейскіх, так і рускіх і савецкіх кампазітараў.

Першыя чатыры канцэрты, прысвечаныя Баху, Гендэлю, Гайдну, Моцарту, Бетховену і Шуберту, прайшлі з вялікім поспехам.

30 сакавіка адбудзецца пяты канцэрт з твораў Шумана і Брамса.

Квартэт Кансерваторыі БССР

Пры Кансерваторыі БССР створан квартэт у складзе дацэнтаў Амітона, Азаяна, Власава і кампазітара Столава. Першае выступленне квартэта адбылося 17 сакавіка.

„Шолам-Алэйхем і фальклор"

У Дзяржаўным выдавецтве Беларусі выйшла кніга кандыдата філалагічных навук крытыка І. Сярэбранага «Шолам-Алэйхем і фальклор» (на яўрэйскай мове).

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

Мінск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду. Уп. Галоўлітбела № Г—1380.